

КАЛІ Ў СЯМ'І ЖЫВЕ ДУШЭЎНАХВОРЫ... 6



СЕЛЬСКАЯ КРАМА З ГАРАДСКІМ АСАРТЫМЕНТАМ МС


Выдаецца з 9 жніўня 1917г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 МАЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 95 (29717)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі**

*(падчас наведвання Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій):*

*«Мы ўбачылі, што сёння сапраўды распрацоўваюцца сучасныя прэпараты, якія павінны выкарыстоўвацца ў сістэме аховы здароўя. Мала таго, яны не проста тут распрацоўваюцца, я яшчэ ўбачыла, што рэагенты, якія ўжываюцца для аналізаў, таксама вырабляюцца тут. Бо кожны чалавек, які прыходзіць здаць кроў, перш за ўсё праходзіць самае сур'ёзнае абследаванне. Гэтыя рэагенты не трэба закупляць па імпарце, і гэта дарагога варта, калі цэнтр працуе на тое, каб меці усе прэпараты ўласнай вытворчасці».*

# ПАД НОВЫМІ ДАХАМІ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У Вязынцы, на радзіме народнага паэта Беларусі Янкі Купалы, завяршаецца рамонтна-рэстаўрацыйная замена дахаў будынкаў філіяла дзяржаўнага літаратурнага музея яго імя. Падчас святкавання 140-годдзя з дня нараджэння нашага слыннага песняра хата, у якой нарадзіўся Іван Луцэвіч, і свіран будуць ужо пад новымі — гонтавымі — дахамі. Брыгада спецыялістаў дзяржаўнага прадпрыемства «Белрэстаўрацыя» намагаецца як мага хутчэй скончыць запланаваныя работы, якія распачаліся мінулай восенню і працягнуліся ранняй вясной. Самыя цяжкія і працаёмкія работы ўжо пройдзены, засталося пакласці лічаныя метры гонтаў і пакрыць іх грунтовым прамочваннем, каб надзейна і даўгавечна засцерагчы драўляную страху. Апошні акорд на знакавым аб'екце робіць калектыў спецыялістаў Мірскага ўчастка на чале з майстрам Андрэем Канановічам. Гэтым разам тут працуюць Сяргей ШАЎКО і два Анатолі — СЕРГІЕНЯ і СТАРЦАЎ — адказныя, старанныя работнікі, якія працуюць натхнёна, «з агеньчыкам». Спадзяюся, іх працоўны настрой і атмасферу вясновай Вязынкі перададуць гэтыя фатаграфіі.**

СТАР. 13

## КОРАТКА

- **19—26 жніўня пройдзе Усебеларускі хрэсны ход.**
- Рознічны тавараабарот у Беларусі ў студзені—красавіку вырас на 2,8 працэнта.
- **У Беларусі адзін з самых нізкіх паказчыкаў смяротнасці немаўлят сярод еўрапейскіх краін.**
- У новым навучальным годзе ў гродзенскім ліцэі адкрыюць профільны клас МНС.
- **АСВОД: у кожным другім выпадку дзіця тоне на вачах бацькоў.**
- Беларускія гоншчыкі прымуць удзел у ралі «Шаўковы шлях».

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# ДЗЕЦІ — ПАД КАНТРОЛЕМ

Асаблівa гэта актуальна падчас летніх вакацый

**Як паказвае жыццё, надзвычайныя сітуацыі, у якія трапляюць дзеці, як правіла, здараюцца тады, калі яны без нагляду. Дзяцей першых гадоў жыцця дастаткова выпусціць з полю зроку ўсяго на некалькі хвілін, як можа здарыцца бяда. Нельга расслабляцца бацькам і тады, калі іх малыя ўжо крыху падраслі. Ад знешніх прычын у Беларусі штогод гіне больш сотні дзяцей. Дарожна-транспартныя здарэнні, атручванні, праглынанне іншародных прадметаў, пажары, выпадзенне з вокнаў — і гэта далёка не поўны пералік сітуацый, якія могуць прывесці да трагедыі.**



СТАР. 3

ЗВЯЗДА 105 гадоў: адрасы газеты

# ПОДЗВІГ ПАД НУМАРАМ АДЗІН

**Восемдзясят гадоў таму, 18 мая 1942 года, у акупаваным Мінску выйшаў першы падпольны выпуск газеты «Звязда»**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Гэта быў выстрал, кулямётная чарга, выбух — друкаванае слова бязлітасна біла па ворагу. Такога ўдару ў спіну гітлераўцы не чакалі. Падпольшчыкі гучна заявілі аб сабе. Выпушчаная газета сведчыла: нягледзячы на масавыя забойствы патрыётаў, беларускі народ не скарыўся — працягвае змагацца і зробіць усё дзеля таго, каб захопнікі пакінулі іх зямлю.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе**

**Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

Меркаванне

# «У час цывілізацыйнага падзелу свету быць нейтральнымі нельга»

**Выступленне Прэзідэнта Беларусі на юбілейным саміце кіраўнікоў краін — членаў АДКБ у Маскве, як і ўсе апошнія прамовы беларускага лідара, выклікала рэзананс не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Мы пацікавіліся меркаваннем члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ігара ГЕДЗІЧА:**

«У сённяшнія часы цывілізацыйнага падзелу свету быць нейтральнымі, займаць пазіцыю «мая хата з краю» нельга. Неяк наш



Прэзідэнт сказаў, што мы ў выпадку неабходнасці будзем з Расіяй стаяць спіна да спіны. Гэта сёння і адбываецца. Верагодна, наспеў час, калі неабходна ў рамках АДКБ мець адчуванне пляча паміж удзельнікамі, каб мы шырокім фронтам маглі супрацьдзейнічаць экспансіі, што адбываецца з Захаду на Усход ва ўсіх сферах: палітычнай, эканамічнай, гуманітарнай», — сказаў сенатар.

Па словах члена Савета Рэспублікі, выступленне Прэзідэнта на саміце ў Маскве было настолькі ў кропку, што некаторыя кіраўнікі краін, верагодна, адчувалі сябе няёмка. «І зразумела чаму: ён адназначыў, што, акрамя таго, што АДКБ ёсць над чым працаваць, але ёсць саюзу і пра што ўспомніць. Напрыклад, падзеі ў Казахстане, калі арганізацыя паказала свой магутны ваенны складнік. Таму я ганаруся, што Прэзідэнт вельмі годна прадстаўляе нашу краіну і робіць важныя крокі ў плане пашырэння ўзаемадзеяння ў рамках Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы», — дадаў Ігар Гедзіч.

Ён падкрэсліў, што зараз час заняць АДКБ пазіцыю, якая дазволіць крызісныя моманты зрабіць менш балючымі для краін-удзельніц аб'яднання.

«Я думаю, што ў найбліжэйшыя год-два мы ўбачым прырастанне колькасці членаў АДКБ. Важна, акрамя таго, пакахаць узровень супрацоўніцтва ў Саюзнай дзяржаве, які можа стаць наратывам узаемадзеяння для АДКБ і ЕАЭС», — рэзюмаваў сенатар.

Зямное і нябеснае

# У выпрабаваннях і спадзяванні на дапамогу Божую

## Мітрапаліт Веніямін верыць у аднаўленне міру ва Украіне — не толькі ў грамадзянскай, але і ў духоўнай сферы

**«Ствараць сучаснасць, упэўнена глядзець у будучыню можна, толькі вывучыўшы ўрокі мінулага. У жыцці беларускага народа было шмат радасных і горкіх падзей, усё гэта лягло ў аснову нашага гістарычнага вопыту. Таму так важна, узіраючыся ў глыбіню стагоддзяў, знайсці і асэнсаваць тое, што дапамагло пераадолець выпрабаванні, што зрабіла нас адзіным стойкім народам са сваёй унікальнай, багатай культурай», — сказаў мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, на прэс-канферэнцыі, прысвечанай 1030-годдзю праваслаўя ў Беларусі.**

«Шлях праваслаўнай царквы на землях Беларусі не быў простым, але менавіта ў выпрабаваннях і спадзяванні на дапамогу Божую сфарміравалася не толькі наша культура і дзяржаўнасць, але і такія асноўныя рысы беларускага народнага характару, як міралюбнасць, цярпімасць, духоўнасць, стойкасць, гатоўнасць прыйсці на дапамогу. Праваслаўная царква на землях Беларусі неаднаразова перажывала цяжкія дзесяцігоддзі ганенняў. Былі часы, калі здавалася, што яна канчаткова загінула і ніколі не вернецца да жыцця. Але заўсёды гэтыя цяжкія часы завяршаліся адраджэннем



царкоўнага жыцця, таму што гэта быў выбар самога народа, яго адданасць праваслаўнай веры — веры айцоў», — звярнуў увагу мітрапаліт Веніямін.

Мітрапаліт упэўнены: праваслаўе з'яўляецца асновай духоўнага жыцця нашага народа. «Менавіта з хрысціянскай школай каштоўнасцяў звяздома ці неўсвядомлена мы звяраем нашы думкі, пачуцці і ўчынкі. Для нас важна не толькі захаваць духоўную спадчыну, якую мы прынялі ад нашых слаўных продкаў, але з малітвай іх прымножыць і з дапамогай Божай будаваць наша жыццё на трывалым грунце, сфарміраваным на хрысціянскай веры, якую на працягу больш як 1000 гадоў захоўвае наш народ, каб пра гэту багатую духоўную спадчыну як мага шырэй і глыбей ведалі ў нашым народзе», — сказаў на заканчэнне ён.

Гаворачы аб падзеях у суседняй Украіне, мітрапаліт адзначыў, што спадзяецца на аднаўленне міру на гэтай зямлі — не толькі ў грамадзянскай, але і ў духоўнай сферы. «Што да Украіны, не можа не засмучаць тое, што палітычны складнік адбіваецца на развіцці царкоўнага жыцця, якое абмяжоўваецца, ставіцца ў жорсткія ўмовы. Тыя, хто імкнецца выканаць свой святарскі і рэлігійны абавязак, часам маюць праследаванне. Тэма балючая, яна патрабуе вырашэння», — адзначыў мітрапаліт Веніямін.

Уладыка лічыць, што ўсё ж такі наступіць час, калі ва Украіне будзе аднаўлены мір не толькі грамадзянскі, але і ў духоўнай сферы. «Напружанне на рэлігійнай глебе адбілася і на развіцці ўнутрыпалітычнай і знешнепалітычнай сітуацыі, якая датычыцца Украіны», — сказаў ён.

«Царква Беларусі моліцца, каб гэтая сітуацыя ўрэгулявалася. Са свайго боку, дзе ёсць магчымасць і неабходнасць у нашай дапамозе, мы яе аказваем, у тым ліку грамадзянам, якія пакідаюць межы Украіны. Спадзяёмся, што ўсё ж пераможа мір і на зямлю Украіны вернецца тое, чаго яна цяпер пазбавілася», — дадаў мітрапаліт.

**• Дарэчы**

**Цэнтральныя ўрачыстасці з нагоды 1030-годдзя праваслаўя на беларускіх землях пройдуць у Полацку 4—5 чэрвеня.**

Узаемадзеянне

# Супрацьстаяць злачынствам разам

**У Мінску адбылася нарада кіраўнікоў сталічных падраздзяленняў органаў унутраных спраў дзяржаў — удзельніц СНД. Дэлегацыі праваахоўнікаў Садружнасці ў такім фармаце сабраліся ў нашай краіне ўпершыню. Фундаментам для іх цеснага практычнага супрацоўніцтва паслужыла аналагічнае пасяджэнне, якое адбылося ў 2019 годзе ва Узбекістане.**

— У 2020 годзе нам давялося супрацьстаяць масавым парушэнням грамадскага парадку і экстрэмісцкім праявам, — заўважыў **міністр унутраных спраў Беларусі, генерал-лейтэнант міліцыі Іван КУБРАКОЎ.** — Дзякуючы дакладным і зладжаным дзеянням праваахоўнікаў мы не дапусцілі дэстабілізацыі абстаноўкі, чым абаранілі краіну і захавалі яе суверэнітэт. Прычым супрацьстаяць каляровым рэвалюцыям і масаваму парушэнню грамадскага парадку ў 2020 годзе без пэўных сур'ёзных наступстваў атрымалася толькі ў Беларусі. Гэта прызнаюць усе. Таму калег найперш цікавіць наш вопыт у дадзеным пытанні, у тым ліку і супрацьдзеянне інфармацыйным войнам.

Сваімі напрацоўкамі беларускія праваахоўнікі падзяліліся з калегамі з краін Садружнасці. Прадстаўнікі праваахоўных ведамстваў наведалі спецпадраздзяленні беларускай міліцыі. У першую чаргу іх цікавіла арганізацыя работы.

Паводле пераканання кіраўніка міліцэйскага ведамства Беларусі, міжнароднае праваахоўнае супрацоўніцтва павінна быць па-за палітыкай і ўлічваць нацыянальныя асаблівасці. Таксама міністр унутраных спраў адзначыў, што сёння як ніколі праваахоўнікі краін Садружнасці павінны быць згуртаванымі. І прывёў прыклад зладжанасці байцоў зводнага батальёна міліцыі капітана Канстанціна Уладзімірава, якія ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны вёў няроўны бой з нямецка-фашысцкімі акупантамі.

— Любыя стратэгіі супрацьдзеяння злачыннасці, іншым выклікам і пагрозам сучаснасці не дапамогуць асобна ўзятай дзяржаве поўнасцю зжыць гэтыя з'явы, — акцэнтавалі ўвагу Іван Кубракоў. — Упэўнены, што форум стане адкрытай пляцоўкай для канструктыўнага дыялогу па абмене прафесійным вопытам і яго наступным укараненні ў нашу штодзённую дзейнасць, а прынятыя рашэнні дазволяць забяспечыць бяспеку грамадзян і ўстойлівае развіццё краін — удзельніц СНД.

**Вераніка КАНЮТА.**


## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества УП «Пинская СПМК-5» (УНП 200111234), объявляет о проведении **08.06.2022 г.** с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных торгов в форме аукциона.

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке:**
**https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/05/spisok-imushhestva-1.pdf**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел.: +375336705001, +375296569865, Виктор.

Продавец: УП «Пинская СПМК-5».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; **contact@bankrottorg.by**.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **07.06.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933 в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **18.05.2022** по 17.00 **07.06.2022** на bankrottorg.by. К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде, по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 760,00 бел. руб.; стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; по лоту № 1 возмещение за оценку – 219,80 бел. руб., по лоту № 2 возмещение за оценку 715,75 бел. руб., по лоту № 3 возмещение за оценку – 81,81 бел. руб., по лоту № 4 возмещение за оценку 815,98 бел. руб., по лоту № 5 возмещение за оценку – 1189,88 бел. руб., за публикацию в СМИ – 800,63 бел. руб., аукционный сбор по лоту № 1, 2, 3 – 5 % от цены реализации имущества, по лоту № 4 – 1 % от цены реализации имущества, по лоту № 5 – 4 % от цены реализации имущества.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 10 (десяти) календарных дней с даты проведения электронных торгов.



## Информация о проведении 31 мая 2022 года в 11.00 повторных аукционных торгов по продаже имущества, принадлежащего УП «Минское отделение Белорусской железной дороги»

**Сведения о предмете торгов** (наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества): изолированное помещение с инв. номером 500/D-686110, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 2-2Н, общая площадь – 239,3 кв. м (назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – помещение неустановленного назначения) и установленные в нем системы и оборудование: система контроля и управления доступом в международных кассах с инв. номером 0440246, автоматическая установка системы охранного телевидения помещений жд касс с инв. номером 0440248, щит ВРУ Щ81 ИНЗ-У 1А касс с инв. номером 0440249, щиток распределительный с блоком АВР Щ81 ИН5-У1А с инв. номером 0440250, теплообменник пластинчатый Р-0,06-1,02-2Х касс с инв. номером 0440253, система видеонаблюдения с инв. номером 0440247, система тепловой автоматики касс с инв. номером 0440252, охранная сигнализация с инв. номером 0440251, концентратор (электрооборудование) ЕА 8086/1 кассы с инв. номером 0440254

| | |
|---|---|
| **Начальная цена** (без учета НДС) – 1 772 080,0 бел. руб. | **Размер задатка –** 177 208,0 бел. руб. |

**Продавец имущества –** УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220030, г. Минск, ул. Свердлова, 28; Минская дистанция гражданских сооружений УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220014, г. Минск, пер. Автодоровский, 11, тел.: (017) 225-22-25, (017) 225-57-89, (017) 225-38-12

**Организатор торгов –** государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 365 48 36

**Срок и место приема заявлений: по 27.05.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6

Порядок оформления участия в торгах и проведения аукциона изложен в извещении о проведении торгов, размещенном на интернет-сайтах: организатора торгов – www.mgcn.by (раздел «Аукционы/Недвижимость в собственность»); Минского городского исполнительного комитета – www.minsk.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»). **Телефон для справок** +375 (17) 365 48 36



## Изменения в проектной декларации ООО «Датч Стар», опубликованной в газете «Звязда» 03.03.2022 г. по объекту

«Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр-та Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина» (1-я очередь строительства)

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

**8 (восемь)** однокомнатных квартир **площадью от 29 до 71 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 2 850 до 3 660 белорусских рублей;**

**3 (три)** двухкомнатные квартиры площадью **от 79 до 138 кв. м,** стоимость 1 кв. м от **2 475 до 3 240 белорусских рублей.**

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади и условий оплаты строящегося жилого дома. Цена сформирована в белорусских рублях.

**Условия оплаты** – полная либо поэтапная оплата цены договора в течение 5 календарных дней с момента регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомление дольщиков с планировками квартир, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется по предварительной договоренности в рабочее время ООО «Датч Стар» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 860. Тел.: 375 (17) 336 73 88, 375 (44) 5343000, 375 (29) 5343000.

УНП 191061436

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **Добрушское районное потребительское общество** (УНП 400005661) 247070, Гомельская обл., Добрушский р-н, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47, тел. (02333) 2-30-46, в лице ликвидатора Беланова Р.Н.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **02 июня 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв № 311/С-46887 (административное здание), расположенное на земельном участке с кадастровым № 321250100003001556, по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Белорусская, 1 | 3400,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 311/С-52052 (столовая), расположенное на земельном участке с кадастровым № 321250100003001593, по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Октябрьская, 1 | 48 635,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 311/С-51823 (магазин), расположенное на земельном участке с кадастровым № 321285603101000180, по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Носовичский с/с, д. Логууны, ул. Ленина В.И., 83А | 5950,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 311/С-52003 (магазин), расположенное на земельном участке с кадастровым № 321285601101000063, по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Носовичский с/с, д. Запрудовка, ул. Юрия Гагарина, 76 | 3900,00 |
| 5 | Капитальное строение с инв. № 311/С-51820 (магазин), расположенное на земельном участке с кадастровым № 321275701601000044, по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, п. Грушевка, 38А | 4200,00 |
| 6 | Капитальное строение с инв. № 311/С-50651 (магазин № 23), расположенное на земельном участке с кадастровым № 321281602601000040, по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Усохо-Будский с/с, д. Дубровка, ул. Советская, 25А | 8400,00 |
| 7 | Капитальное строение с инв. № 311/С-52005 (наименование – магазин № 49), расположенное на земельном участке с кадастровым № 321284804601000356, по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Ленинский с/с, аг. Ленино, ул. Советская, 59 | 8850,00 |
| 8 | Капитальное строение с инв. № 311/С-52004 (магазин № 6), расположенное на земельном участке с кадастровым № 321286800601000056, по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Усохо-Будский с/с, д. Николаевка, ул. Кооперативная, 102А | 6450,00 |
| 9 | Станок токарный (модель 1Л62), инв. № 2168/69. 1969 г. в., Гомельская обл., г. Добруш, пр-т Луначарского, 35 | 1800,00 |

Телефон для ознакомления и осмотра: +375 (29) 690-00-10.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 19.05.2022 г. 09.00 по 01.06.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY,** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену за лот. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 21.04.2022 г.

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **Речицкое районное потребительское общество** (УНП 400037088), 247500, г. Речица, ул. Привокзальная, д. 2 в лице ликвидатора Беланова Руслана Николаевича, тел. +375 (29) 690-00-10.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **02 июня 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль ГАЗ 3309, АФТ-3309 «Любава», 2008 г. в., рег. знак № АВ 5980-3, инв. № ТР161, грузовой фургон изотермический | 4 770,00 |
| 2 | Автомобиль ГАЗ 3302, АФХ 3302 «Любава», 2009 г. в., рег. знак № АЕ 4202-3, инв. № Х1136, грузовой фургон | 4 950,00 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 19.05.2022 г. 09.00 по 01.06.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY**; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» 06.04.2022 г.


# ДЗЕЦІ — ПАД КАНТРОЛЕМ

### Адпачынак без непрыемнасцяў

З мэтай прыцягнення ўвагі да праблем дзіцячага свавольства з агнём і гібелі дзяцей на пажарах, зніжэння колькасці надзвычайных сітуацый з удзелам дзяцей і забеспячэння іх бяспекі ў хаце, на вуліцы і ў іншых месцах з 10 мая да 1 чэрвеня ў краіне аб'яўлена рэспубліканская акцыя «Не пакідайце дзяцей адных!». Падчас прафілактычных мерапрыемстваў, якія ўжо праводзяцца ратавальнікамі, супрацоўнікі МНС яшчэ раз патлумачаць бацькам, чаму дзецям нельга заставацца адным дома, і раскажуць, як не стаць ахвярамі ўласных памылак.

Мерапрыемствы запланаваны ў два этапы. Падчас першага маштабная праграма чакае наведвальнікаў гандлёва-забаўляльных цэнтраў, кінатэатраў, іншых грамадскіх месцаў, дзе дарослыя адпачываюць разам з дзецьмі. Для іх арганізаваны інтэрактыўныя пляцоўкі з конкурсамі, віктарынамі, гульнямі, удзельнікам якіх уручаць сувенірную, навучальную і наглядна-выяўленчую прадукцыю. Не застануцца без увагі ратавальнікаў і аматары актыўнага адпачынку. Разам з дзецьмі бацькі змогуць праверыць свае спрыт, кемлівасць і веды ў галіне бяспекі, стаць прыкладам у гэтай важнай справе для свайго дзіцяці.

З 23 мая да 1 чэрвеня ў цэнтры ўвагі прапагандыстаў будуць знаходзіцца будучыя бацькі, а таксама тыя, хто імі нядаўна стаў. Акцэнт зроблены на мам: менавіта жанчыны праводзяць большасць часу з дзецьмі. Аднак не застануцца без увагі ратавальнікаў і маладыя таты, а таксама мужчыны, якія вось-вось імі стануць, — яны не менш за мам павінны клапаціцца аб бяспецы сваіх нашчадкаў. Віртуальная экскурсія па кватэры, інтэрактыўныя заняткі «Галоўны эксперт», віктарыны дапамогуць будучым мамам і татам не ўпусціць важных момантаў падчас стварэння бяспечных умоў для немаўляці. А кагосьці супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях павіншуюць у дзень выпіскі з радзільні, пры гэтым абавязкова нагадаўшы маладым бацькам аб бяспецы.



— Калі мы кажам пра бяспеку дзяцей, то гэтае пытанне павінна быць на кантролі не толькі ў перыяд акцыі: аб бяспецы сваіх дзяцей бацькі павінны памятаць заўсёды, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Наперадзе — вялікія летнія канікулы, і дарослыя ўжо сёння павінны падумаць аб тым, чым у гэты час будзе занята іх дзіця. Абавязкова пагаварыце з ім, чаму небяспечна гуляць на будаўнічай пляцоўцы, чыгунцы, абмяркуйце паводзіны на вадаёмах. У гэтым бацькам дапамогуць мультфільмы МНС «Чароўная кніга», «Спецатрад 112», а таксама мабільны дадатак «Дапамога побач», сайт ведамства. Вельмі важна быць сябрам свайму дзіцяці: ведаць, дзе ён гуляе — з кім сябруе, якія ролікі глядзіць у інтэрнэце. Калі мы кажам аб маленькіх дзецях, то галоўнае — гэта клопат і знаходжанне дзіцяці на адлегласці выцягнутай рукі. Не варта забываць і аб тым, што прыкладам для дзяцей, у тым ліку ў пытанні бяспекі, з'яўляюцца самі бацькі.

Асаблівая ўвага ратавальнікаў накіравана на шматдзетныя сем'і і тыя, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Для іх урокі бяспекі будуць праведзены дома. Як для дзяцей, так і для іх бацькоў супрацоўнікі МНС правядуць адпаведныя гутаркі, гульні і віктарыны па асновах бяспечнай жыццядзейнасці, пакажуць мультфільм «Чароўная кніга» і ўручаць падарункі.

Аб тым, як забяспечыць адпачынак без непрыемнасцяў у летні перыяд, супрацоўнікі МНС раскажуць і на бацькоўскіх сходах ва ўстановах адукацыі, у тым ліку дашкольных. Фінальныя мерапрыемствы адбудуцца на адкрытых пляцоўках у парках забаў і адпачынку, каля палацаў культуры, кінатэатраў, гандлёва-забаўляльных цэнтраў ва ўсіх рэгіёнах краіны.

### Трагедыі, якіх магло не быць

Акцыя ратавальнікаў — не даніна модзе і не мерапрыемства дзеля птушачкі. Кожны год, асабліва з пачаткам летняга сезона, у краіне гінуць дзеці: падаюць з адчыненых акон, тонуць у азёрах і рэках, трапляюць пад калёсы аўтамабіляў і не бачаць цягнікоў...

Па прыклады далёка хадзіць не трэба. У сярэдзіне красавіка ратавальнікам паступіла паведамленне аб тым, што патрабуецца дапамога ў вызваленні левай нагі дзіцяці з металічнай канструкцыі. Здарэнне адбылося ў Барысаве. Ратавальнікам, якія прыбылі на выклік, стала вядома, што васьмігадовы хлопчык разам з сябрамі гуляў на вуліцы. Па неасцярожнасці яго нага саслізнула і апынулася ў металічнай канструкцыі, якая прызначана для выбівання дываноў. Пры дапамозе спецыяльных інструментаў супрацоўнікі МНС расціснулі металічныя пруты, і хлопчык змог дастаць нагу. На шчасце, у медыцынскай дапамозе пацярпелы не меў патрэбы.

Днямі раней ратавальнікі выязджалі на пошук дзіцяці, які патануў у вадаёме ў Пухавіцкім раёне. Пошукава-ратавальныя работы доўжыліся некалькі дзён. Была задзейнічана вялікая колькасць ратавальнікаў, 11 адзінак тэхнікі. Больш як 40 разоў вадалазы спускаліся пад ваду — толькі на чацвёртыя суткі цела хлопчыка было выяўлена на глыбіні 4,5 метра.

Іншым аматарам пагуляць каля вадаёма пашчасціла больш. У апошнія дні зімы двое пяцікласнікаў хадзілі па тонкім лёдзе Салігорскага вадасховішча, праваліліся. Адзін з хлопчыкаў выбраўся з палонкі самастойна. Дзякуючы відавочцу, які праходзіў непадалёк ад месца здарэння, выратаваўся і другі. Мужчына, які заўважыў хлопчыка, які тоне, падпоўз да яго і працягнуў палку. Дзіця схапілася за яе і выбралася на лёд.

Нямала дзяцей за гэты ацяпляльны сезон стала ахвярамі агню. Дагэтуль не можа справіцца з наступствамі пажару маленькі Давід, які ў двухмесячным узросце пацярпеў ад агню ў сваім доме ў Лідзе. У адрозненне ад яго, маленькаму жыхару Жодзіна пашанцавала. Калі ў кватэры, дзе ён жыве, адбыўся пажар, акрамя хлопчыка, у хаце нікога не было. Незадоўга да здарэння бацьку выклікалі на працу. Шасцігадовы хлопчык, які застаўся дома адзін, дабраўся да запалак. Калі загарэлася мэбля, ён спалохаўся і выбег на вуліцу. На шчасце, падчас пажару ў шматкватэрным жылым доме ніхто не пацярпеў. Гаспадароў, якія не ведалі, што нельга малых дзяцей пакідаць без нагляду, чакаў сур'ёзны рамонт. Аднак добра, што толькі гэтым усё скончылася.

Ратавальнікі звяртаюць асаблівую ўвагу бацькоў: паклапаціцеся аб тым, як ваша дзіця будзе праводзіць летнія канікулы, загадзя. Калі вы самі не можаце быць з ім увесь гэты час, сёння ёсць шмат магчымасцяў, каб ваша дзіця правяло час весела, а галоўнае, бяспечна. Адпраўляючы яго да бабулі і дзядулі, прадумайце, ці змогуць яны з улікам свайго ўзросту і здароўя гарантаваць свайму нашчадку бяспечнае баўленне часу.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Улады Малі паведамілі аб прадухіленні спробы перавароту



Урад Малі паведаміў аб прадухіленай спробе ваеннага перавароту, арганізаванай, як сцвярджаецца, пры замежнай падтрымцы. Пры гэтым ён запэўнівае, што сітуацыя пад кантролем, і заклікае насельніцтва захоўваць спакой. Аб гэтым гаворыцца ў паведамленні ўрада, апублікаваным афрыканскімі СМІ. Улады растлумачылі, што спроба перавароту адбылася яшчэ ў ноч на 12 мая. Яе здзейсніла «невялікая група афіцэраў». У паведамленні адзначаецца, што вайскоўцаў падтрымлівала заходняя краіна, якая менавіта, не ўдакладняецца. «Спробу перавароту ўдалося прадухіліць, дзякуючы пільнасці і прафесіяналізму сіл бяспекі Малі», — падкрэслілі ва ўрадзе.

### Нізкія пенсіі ў Германіі вымушаюць усё больш пенсіянераў выходзіць на работу

У Германіі за апошнія некалькі гадоў рэзка вырасла колькасць пенсіянераў, якія выходзяць на работу. Пра гэта паведаміў тэлеканал RT. Паводле даных Міністэрства працы Германіі, у 2021 годзе ў краіне налічвалася каля мільёна занятых пенсіянераў. Для параўнання, у 2010-м іх колькасць складала 685 тысяч. Большая частка працуючых пенсіянераў прыпадае на заходнюю частку краіны. Па словах дэпутата ад партыі левых Сарэна Пельмана, такая тэндэнцыя сумная і сведчыць аб тым, што ўзровень пенсій у Германіі недастаткова высокі. Адзначаецца, што мінулым летам улады павысілі пенсіі, аднак рэзкая інфляцыя пагоршыла сітуацыю. Як вядома, у гэтым месяцы ў Германіі была зафіксавана рэкордная інфляцыя — 7,4 працэнта.

# ПОДЗВІГ ПАД НУМАРАМ АДЗІН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Подзвіг журналістаў-падпольшчыкаў, здзейснены ў маі — кастрычніку 1942 года ў акупаваным Мінску, не мае аналагаў у свеце. Чатыры нумары падпольнай «Звязды», якія ўбачылі свет у захопленым горадзе, мацней любой зброі нанеслі ўдар па ворагу, прымусілі людзей паверыць, што Перамога будзе на нашым баку. Праўда, за гэта была заплачана вельмі высокая цана...

Многія з тых, хто быў задзейнічаны ў выпуску падпольнай газеты, а таксама прапаноўваў свае жыллё пад рэдакцыйныя патрэбы, загінулі ад рук фашыстаў. Адзін з першых — рэдактар падпольнага выпуску «Звязды» № 1 Уладзімір Амельянюк, будучы Герой Савецкага Саюза. Непадалёк ад месца яго гібелі, на цяперашняй плошчы Незалежнасці каля Чырвонага касцёла ў Мінску, 24 верасня 1980 года быў адкрыты помнік. Сціплы надпіс на ім сведчыць, што тут увекавечана памяць першага рэдактара падпольнай «Звязды», а таксама іншых журналістаў-падпольшчыкаў, якія стварылі газету ў захопленым горадзе.

## У тыле ворага

Сёння складана ўявіць, што матэрыялы гэтага нумара набіраліся ў логаве ворага — у нямецкай тыпаграфіі, якая ў гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзілася ў сучасным Доме друку. Гэта стала магчымым дзякуючы рабочым друкарні: бацьку і сыну Воранавым, Барысу Пупко, Міхаілу Свірыдаву і Броні Гофман, якія з'яўляліся членамі адной з першых падпольных груп Мінска. Пасля таго як падпольшчык Уладзімір Амельянюк устанавіў з імі сувязь, рабочыя ажыццявілі набор матэрыялаў першага выпуску непасрэдна ў самой тыпаграфіі. Усё астатняе, што патрэбна было для выпуску газеты: наборныя касы, паперу, фарбы, гранкі, вярстаткі, ім удалося незаўважна вынесці. Дзеля ўвекавечвання подзвігу патрыётаў на будынку Дома друку на мінскім праспекце Незалежнасці ўсталявана мемарыяльная дошка.

Дэбютны падпольны нумар «Звязды» быў надрукаваны 18 мая 1942 года ў хаце Міхаіла Воранава і яго сына Міхаіла па адрасе: Рымарская, 13 (на сучаснай вуліцы Караля). Аб найважнейшай падзеі ў гісторыі Мінскага падполля сведчыць мемарыяльная шыльда, усталяваная на доме, на месцы якога ў гады акупацыі нелегальна знаходзілася рэдакцыя.



Уладзімір Амельянюк.

— Ідэя стварэння падпольнай «Звязды» паступіла з кіруючых органаў Вялікай зямлі, — расказвае **даследчык гісторыі Мінскага падполля кандыдат гістарычных навук Яўген БАРАНОЎСКІ.** — З матэрыялаў справаздач Мінскага гарадскога падпольнага цэнтра вынікае, што ў праграму дзейнасці падпольшчыкаў ужо на першым этапе іх існавання ўваходзіла ў якасці адной з цэнтральных задач арганізацыя падпольнай друкарні на базе матэрыялаў былых раённых друкарань. Але нельга лічыць выхад «Звязды» толькі выкананнем спушчанага «зверху» плана. Яе з'яўленне — вынік канцэнтрацыі ў адным месцы мужных і таленавітых людзей.



Помнік Уладзіміру Амельянюку каля Самахвалавіцкай сярэдняй школы, дзе вучыўся будучы Герой Савецкага Саюза.

## Друкарню шукалі разведчыкі

Адказнасць за падрыхтоўку і выпуск першага нумара падпольнай газеты была ўскладзена на аднаго з актывістаў Мінскага партыйнага падполля, нядаўняга студэнта Уладзіміра Амельянюка, які да вайны скончыў тры курсы Камуністычнага інстытута журналістыкі. Кватэра па вуліцы Чарнышэўскага ў Мінску, дзе жылі яго бацькі, з'яўлялася канспіратыўнай: тут сустракаліся кіраўнікі, члены падпольнага камітэта, партызанскія сувязныя. Акрамя таго, яна была прытулкам для многіх параненых савецкіх вайскоўцаў.

Уладзімір Сцяпанавіч Амельянюк — легенда не толькі нацыянальнай, але і сусветнай журналістыкі. Гэта адзіны рэдактар у час Другой сусветнай вайны, якому было прысвоена найвышэйшае званне — Герой Савецкага Саюза (падобных прыкладаў на прасторах СССР не было). Надзвычай папулярную і ўплывовую да вайны газету ён узначаліў у няпоўныя 25 гадоў.

Многія матэрыялы гэтага выпуску былі напісаны асабіста Уладзімірам Амельянюком. Генадзь Будай, з якім яны сябравалі, працавалі ў дзяржынскай раённай газеце, пасля вучыліся ў Камуністычным інстытуце журналістыкі, а потым былі сярод арганізатараў патрыятычнага падполля, расказваў, што Уладзімір Сцяпанавіч спяшаўся, рыхтуючы матэрыялы для першага нумара падпольнай «Звязды». «Яго блакнот папаўняўся фактамі аб баявых дзеяннях народных мсціўцаў, аб зверствах фашыстаў, — успамінаў падпольшчык. — Скрупулёзна адбіраў ён найбольш важныя паведамленні Маскоўскага радыё. Шмат якую інфармацыю хацелася змясціць у маленькім газетным лістку. Але трэба было «сціскаць», і Амельянюк па некалькі разоў перапісваў матэрыялы, стараўся ўдыхнуць у іх жар свайго сэрца, усю нянавісць да ворага».

І гэта адчуваецца амаль у кожным радку легендарнага выпуску. «Бязлітасна знішчайце фашысцкіх гадаў, пашырайце партызанскую барацьбу. Зрабіце ўсё, каб наблізіць час разгрому і гібелі крывавага фашызму!» — заклікала «Звязда».

Кожнае слова, быццам куля, страляла ва ўпор. Сваім з'яўленнем у тыле ворага газета ашаламіла фашыстаў. Мінскія падпольшчыкі гучна заявілі аб сваім існаванні. «Тыраж яе быў невялікі, але абслугоўвала даволі вялікае кола чытачоў, — успамінаў падпольшчык Георгій Сапун. — Першы, хто дастаў яе, пасля прачытання перадаваў суседу, знаёмаму, той іншаму, і так яна ішла па ланцужку і зачытвалася да дзірак. Нярэдка былі выпадкі, калі яна, так ідучы па ланцужку, вярталася зноў у першыя рукі. Але з кожным выданнем тыраж яе рос».

Для пошуку падпольнай друкарні з Берліна выклікалі вопытных разведчыкаў. Гітлераўцы ўсведамлялі: знішчэнне самай вядомай і аўтарытэтнай беларускай газеты нанясе непапраўны ўрон падпольнаму руху. Тым, хто ўкажа на нелегальную друкарню, акупанты абяцалі заплаціць 75 тысяч нямецкіх марак — па тым часе велізарныя грошы. У грамадскіх месцах і на заводах пачаліся павальныя вобыскі і арышты: тых, у каго знаходзілі хоць бы адзін экзэмпляр газеты, расстрэльвалі.



Уладзімір Амельянюк — піянерважаты ў Дзяржынскай сярэдняй школе (*другі ў верхнім радзе*).




Мемарыяльная шыльда на адной з мінскіх вуліц, якая носіць імя Уладзіміра Амельянюка.

Выпадкова падпольшчыкаў выдала родная цётка: «Яе затрымалі ў краме, у яе было дзесяць картак хлебных, — расказваў Васіль Сайчык, які таксама быў удзельнікам Мінскага падполля. — Спыталі, дзе яна іх брэ, тая і сказала, што Воранаў даў». Аказалася, што на кватэры ў падпольшчыкаў яшчэ друкаваліся хлебныя карткі, карткі для даткового пайка, пашпарты, біржавыя карткі, даведкі з месца працы, падрабляліся пячаткі і штампы. Менавіта дзякуючы Міхаілу Воранаву мінскім падпольшчыкам удалося здабыць два экзэмпляры спіса шпіёнаў, якія праз партызанскую брыгаду «Дзядзька Коля» былі адпраўлены ў Маскву. За гэта, а таксама за ўдзел у выпуску газеты, была заплачана вельмі высокая цана: ад рук фашыстаў загінула сям'я з трох чалавек — бацька, сын і яго жонка.




Мемарыяльная дошка на будынку Дома друку на праспекце Незалежнасці, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны размяшчалася нямецкая друкарня, у якой былі набраны матэрыялы першага нумара падпольнай «Звязды».

## Трагедыя сям'і Амельянюкоў

Праз некалькі дзён пасля выхаду першага нумара падпольнай газеты, 26 мая 1942 года, у ходзе перастрэлкі з агентам СД Уладзімір Амельянюк быў забіты. Адбылося гэта ў раёне месца, дзе цяпер героя, а таксама іншым журналістам-падпольшчыкам пастаўлены помнік.

Доўгі час у біяграфіі Уладзіміра Амельянюка было шмат белых плям. Некалькі гадоў таму некаторыя з іх удалося ліквідаваць. У першую чаргу дзякуючы пляменніцы журналіста-падпольшчыка Надзеі Амельянюк, з якой мне пашчасціла пазнаёміцца. Яна расказала, што лёс яе бабулі і дзядулі, якія таксама супрацоўнічалі з Мінскім падпольным гаркамам КП(б)Б, склаўся трагічна. Бацьку, Сцяпана Кандратавіча, 9 мая 1942 года забілі акупанты. Маці, Паўліну Сцяпанаўну, 24 мая 1945 года без пульса знайшлі на вуліцы — сэрца. Сястра Зінаіда трапіла пад бамбёжку яшчэ ў самым пачатку вайны.

«Вайна нанесла шмат гора: разбіла вялікую дружную сям'ю (загінулі муж, сын, дачка, унукі), — сведчыла падпольшчыца Марыя Рынкевіч, якая таксама мела дачыненне да выпуску нелегальнай «Звязды». — Акупанты з кулямёта абстралялі іх хату. Яна бачыла спалены горад, шыбеніцы, слёзы мацярок. Але гэта не зламала маці, жанчыну, чалавека».

Магілу сваёй бабулі, якая адзіная, хто яе мае, даглядае Надзея Амельянюк. Яна — дачка роднага брата Героя Савецкага Саюза. Яе бацька, Мікалай Сцяпанавіч Амельянюк, на пяць гадоў быў старэйшы за свайго знакамітага брата-падпольшчыка. Ён адзіны, хто выжыў з гэтай вялікай сям'і. Хоць сам неаднойчы вісеў на валаску ад смерці. Для Мікалая Амельянюка вайна пачалася ў 1941 годзе. Каля Оршы яго часць трапіла ў акружэнне. Доўгія тры гады ён знаходзіўся ў палоне, за гэты час змяніў не адзін канцлагер, але выжыў. Пасля вызвалення саюзнікамі трапіў у амерыканскую дывізію, у складзе якой і заканчваў вайну. Дамоў вярнуўся ў 1946-м: на радзіме яго чакаў лёс ворага народа.

Удзельнікам Вялікай Айчыннай Мікалая Амельянюка признали толькі праз некалькі дзесяцігоддзяў пасля вайны. Ён яшчэ паспеў расказаць пра лёс знакамітага брата: выступаў у дружынах імя Уладзіміра Амельянюка, быў частым госцем у Дзяржынскай школе № 2, дзе будучы герой працаваў піянерважатым, запрашалі яго і ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — менавіта брат журналіста-падпольшчыка перадаў у музей медаль «Залатая Зорка», прысвоены Уладзіміру Амельянюку пасмяротна да 20-годдзя Перамогі.

Доўгі час быў невядомы лёс жонкі журналіста-падпольшчыка Лідзіі і іх сына Генадзя. «Яны разам з маёй мамай і братам эвакуіраваліся з акупаванага Мінска ў пачатку вайны», — расказала Надзея Амельянюк. — Дзеці, мой родны брат Сярожа і Гена Амельянюк, памерлі па дарозе. Пасля вайны Ліда выйшла замуж, жыла ў Маскве, ад другога шлюбу нарадзіла сына. Памятаю, як аднойчы яна прыязджала да нас у вёску. Пакуль была жывая, падтрымлівала стасункі з маёй мамай».

***

Нягледзячы на забойства Уладзіміра Амельянюка і падпольшчыкаў Воранавых, выданне «Звязды» ў акупаваным Мінску працягвалася. Пра абставіны далейшага выхаду газеты, а таксама лёс іншых журналістаў-падпольшчыкаў мы раскажам у наступных выпусках рубрыкі.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**


ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!
ЗВЯЗДА
Орган Мінскага Гаркома КП(б)Б
№ 1 ЧЭРВЕНЬ 1942 г.
РЭДКАЛЕГІЯ.
1942 ГОД ПАВІНЕН БЫЦЬ ГОДАМ ПОЎНАГА РАЗГРОМА ВОРАГА!
СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!
ШЫРЭЙ ПАРТЫЗАНСКУЮ БАРАЦЬБУ!
БЛІЗКІ ЧАС АСЛАБАНЕННЯ
ВЕСТКІ З ФРАНТОЎ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Першы нумар падпольнай «Звязды», які выйшаў у акупаваным Мінску 18 мая 1942 года. У памяць аб загінулым рэдактары выпуск быў перавыдадзены ў чэрвені 1942 года.

# «МАЛАДЗЁЖНЫ ПАРЛАМЕНТ — ГЭТА МАГЧЫМАСЦЬ БЫЦЬ ЗАЎВАЖАНЫМІ, КАБ РЭАЛІЗАВАЦЬ СВОЙ ПАТЭНЦЫЯЛ»

**Два гады таму пры Нацыянальным сходзе з'явіўся Маладзёжны парламент. Узначаліць яго даверылі выпускніку Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, юрысту-пачаткоўцу Ягору Макарэвічу. Сёння ён — чарговы герой нашай рубрыкі. У інтэрв'ю для «Плеяды маладых» Ягор падвёў першыя вынікі дзейнасці Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе, расказаў, як сфарміруюць новае скліканне, і растлумачыў, чаму грамадская дзейнасць — аснова поспеху для моладзі.**

***— Маладзёжны парламент — грамадскі орган, які праз пару месяцаў будзе адзначаць сваё двухгоддзе. Раскажыце пра ўзнікненне вашай структуры і яе дзейнасць.***

— Першае скліканне Маладзёжнага парламента заканчвае сваю двухгадовую дзейнасць 2 ліпеня. Такая структура з'явілася ў краіне ўпершыню, хоць сама ідэя маладзёжнага парламентарызму існавала даўно. У 2017 годзе яе падтрымаў Прэзідэнт. На працягу трох наступных гадоў задума прапрацоўвалася і, нарэшце, у 2020 годзе ажыццявілася. Асноўная мэта работы Маладзёжнага парламента ў тым, каб дэпутаты і сенатары пры разглядзе пытанняў мелі на ўвазе меркаванне моладзі, а моладзь разумела сутнасць працэсаў дзяржаўнага кіравання.

Маладзёжны парламент уключае 70 прадстаўнікоў усіх абласцей краіны і горада Мінска ва ўзросце ад 18 да 31 года. Гэта, напрыклад, маладыя дэпутаты мясцовых Саветаў, члены грамадскіх аб'яднанняў, партый, маладыя лідары, якія працуюць на разнастайных прадпрыемствах, ва ўстановах, і пры гэтым актыўна займаюцца грамадскай дзейнасцю.

Іх асноўная задача — даносіць погляды маладзёжнага асяроддзя да нашых парламентарыяў і, наадварот, дзяржаўную пазіцыю — да аднагодак. Моладзь больш даверліва ўспрымае інфармацыю ад сваіх равеснікаў. Вось гэтым мы займаліся два гады і можам ужо падводзіць першыя вынікі, бо стаім на парозе фарміравання новага склікання. Яно, дарэчы, будзе створана па новых правілах. Туды ўвойдуць прадстаўнікі кожнага раёна краіны і гарадоў абласнога падпарадкавання, — каля 140 чалавек.

**Прынцып па жыцці: «Самалёты ўзлятаюць супраць ветру».**

***— Як будуць праходзіць выбары?***

— Кожны раённы Савет дэпутатаў накіруе сваіх прадстаўнікоў. Як правіла, гэта будуць члены маладзёжных парламенцкіх структур, створаных пры Саветах дэпутатаў. Гэта не значыць, што ў новым складзе абавязкова павінны быць толькі парламентарыі. Знойдуць там сваё месца і іншыя маладыя лідары, якія дасягнулі значных вынікаў. Дарэчы, усе нашы парламентарыі працуюць на грамадскіх пачатках, паралельна з асноўным месцам. У нас ёсць свае профільныя камісіі. Напрыклад, камісію па ахове здароўя ўзначальвае малады хірург-анколаг, камісію па інфармацыйнай камунікацыі — дзяўчына-карэспандэнт «СБ. Беларусь сегодня», камісію па пытаннях навакольнага асяроддзя — ляснічы.

***— Падводзячы першыя вынікі вашай двухгадовай работы, як вы лічыце, чаго вам удалося дасягнуць?***

— Па сутнасці, мы ўпершыню сфарміравалі сістэму маладзёжнага парламентарызму ў краіне. Маладзёжны парламент стварае сацыяльны ліфт, які дазваляе маладым быць заўважанымі ў кожным раёне, вобласці. Наша асноўная задача, вядома, — і ўдзел у заканатворчым працэсе. У Маладзёжнага парламента ёсць магчымасць на розных стадыях распрацоўкі законапраектаў уносіць свае прапановы. Такіх ініцыятыў ад нас паступае шмат: ад аховы здароўя да ліцэнзавання прадпрымальніцкай дзейнасці. І нашы прапановы ўлічваюцца.

***— Вы кажаце пра сацыяльны ліфт. То-бок членства ў Маладзёжным парламенце — магчымасць руху па кар'ернай лесвіцы?***

— Пачну з таго, што кар'ерызм — гэта не дрэнна. Любы



чалавек хоча рэалізаваць свае прафесійныя амбіцыі, але кар'ерызм без ведаў — бессэнсоўны. Маладзёжны парламентарызм дае магчымасць людзям, якія ўжо маюць лідарскія якасці, займець уменні, каб працаваць у дзяржаўнай сістэме. Ты можаш скарыстацца гэтай магчымасцю — і сацыяльны ліфт у дачыненні да цябе спрацуе, цябе заўважаць. То-бок Маладзёжны парламент — гэта магчымасць быць заўважанымі, каб рэалізаваць свой патэнцыял.

***— Вы ўваходзілі ў Канстытуцыйную камісію па распрацоўцы абнаўленняў у Асноўны Закон. Што вам даў такі вопыт?***

— Я па адукацыі юрыст, заканчваў Акадэмію кіравання, магістратуру юрфака БДУ. А ў юрыдычнай навуцы канстытуцыйнае права займае важнае месца. Калі мне пашчасціла ўвайсці ў склад Канстытуцыйнай камісіі, я зразумеў, што гэта як для краіны, так і для мяне асабіста — гістарычная падзея. З аднаго боку, каласальны вопыт, а з другога — крэдыт даверу, які прыйдзецца доўга апраўдваць. Увогуле, маладыя парламентарыі спрычыніліся да работы над Канстытуцыяй. Яны сустракаліся ў рэгіёнах з аднагодкамі і акумулявалі іх прапановы ў закон. Вынік — у Канстытуцыі з'явіўся 31-ы артыкул, які гарантуе маладым людзям поўныя правы. Гэтая ідэя была падтрымана членамі Савета Рэспублікі.

***— Ваш шлях у грамадскую дзейнасць пачаўся з Маладзёжнай палаты Мінгарсавета. Да гэтай справы, як вы адзначалі, падштурхнулі цікаўнасць і жаданне ствараць. Погляды змяніліся?***

— Я гэтых прынцыпаў прытрымліваюся і сёння. Вельмі ўдзячны Нацыянальнаму сходу за магчымасць убачыць закулісе парламенцкага жыцця. Маё жаданне ствараць, калі я пачынаў займацца маладзёжным парламентарызмам, рэалізавалася. І мае жыццёвыя ідэалы не змяніліся. Работа ў Маладзёжнай палаце і Маладзёжным парламенце — гэта розная. Маладзёжная палата Мінгарсавета рэалізоўвала праекты лакальнага характару, але гэты вопыт вельмі дапамог. Дзякуючы яму калегі выбралі мяне на пасаду старшыні Маладзёжнага парламента. Дарэчы, у юнацкай палаце Мінгарсавета мы займаліся падрыхтоўкай прававой базы для стварэння Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе.

***— Як вы вучыліся ў школе?***

— Я гуманітарый і люблю больш дысцыпліны гістарычнага профілю, грамадазнаўства, літаратуру. Мне было цяжка асвойваць фізіку, матэматыку, хімію, таму не быў выдатнікам. Але і сярод двоечнікаў не хадзіў. Крыху не пашчасціла пры паступленні — матэматыку, якую не любіў, прыйшлося здаваць на ЦТ ва ўніверсітэт. Таму не трапіў на бюджэт.

Я лічу, што кожнаму маладому чалавеку акрамя адукацыі, неабходна мець яшчэ нейкае захапленне — спорт або грамадскую дзейнасць. Гэта як элемент уласнага самавыхавання. Я веру, што маладыя людзі, якія займаюцца нечым акрамя адукацыі, фарміруюцца як цэласныя асобы. Усе гады маёй вучобы ў Акадэміі кіравання я займаўся маладзёжным парламентарызмам. Але і вучыўся добра, бо мне падабаліся юрыдычныя дысцыпліны. Таму паступіў у магістратуру юрфака БДУ, а цяпер вучуся ў аспірантуры.

***— Вы ўжо закранулі пытанне адукацыі. Вучыліся ў Акадэміі кіравання на юрыста. Верагодна, сустракаліся з думкай, што досыць у нашай краіне эканамістаў, юрыстаў ды журналістаў. Наколькі запатрабаваная сёння прафесія юрыста?***

— Я мэтанакіравана ішоў не столькі на юрыдычную спецыяльнасць, колькі ў Акадэмію кіравання. Мне была цікавая сфера дзяржкіравання. Я ні капелькі не шкадую, што выбраў гэту ўстанову. Акрамя класічнай юрыдычнай адукацыі, якую можна атрымаць у шматлікіх ВНУ краіны, я маю веды ў сферы дзяржаўнага кіравання. У мяне была магчымасць вучыцца ў вядучых кіраўнікоў-практыкаў, займець сувязі з сакурснікамі, якія сёння працуюць у дзяржаўным сектары. Таму я мяркую, не важна, якая колькасць на рынку вакансій прадстаўнікоў той ці іншай спецыяльнасці. Калі ты валодаеш навыкамі, станеш запатрабаваным спецыялістам. Галоўнае — не гнацца за модай, а разумець, што табе блізка і наколькі здолееш сябе рэалізаваць у галіне.

***— Якім было ваша першае месца работы?***

— Мне пасля выпуску пашчасціла... Але адразу падкрэслю: гэта вынік грамадскай дзейнасці, якой я займаўся падчас вучобы і ў школе, і ў Акадэміі кіравання. Некаторыя памылкова думаюць, што ў Маладзёжны парламент можна трапіць «па блаце». Але гэта не так. У нашым скліканні кожны — рэальны лідар меркаванняў, які мае падтрымку равеснікаў.



Мне прапанавалі пасля ВНУ пайсці працаваць памочнікам старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Ірыны Анатолеўны Старавойтавай. Я працаваў з ёй два гады. Пасля — у Галоўным інфармацыйна-аналітычным цэнтры Міністэрства адукацыі. Калі ў 2020 годзе быў сфарміраваны Маладзёжны парламент, мне прапанавалі стаць памочнікам намесніка старшыні Савета Рэспублікі Анатоля Міхайлавіча Ісачанкі. З пачаткам работы Маладзёжнай палаты многія маладыя рабяты сябе зарэкамендавалі і сталі памочнікамі сенатараў.

Калі Анатоль Міхайлавіч узначаліў Магілёўскі аблвыканкам, я падумаў, што неабходна сканцэнтравацца на навуковай рабоце, і пайшоў працаваць выкладчыкам на юрфак БДУ. Адчуваю сябе там максімальна камфортна, цяпер выкладаю паліталогію, дзяржаўнае кіраванне і палітыку на розных факультэтах.

***— То-бок Маладзёжны парламент — грамадская нагрузка, за якую вы не атрымліваеце грошы?***

— Так. Асабліва ў 2020 годзе мне і калегам казалі, што мы падтрымліваем дзяржаўны курс за нейкія вар'яцкія грошы. Гэта няпраўда. Нам ніхто не плаціць ні за пазіцыю, ні за нагрузку ў Маладзёжным парламенце

***— Працягнем тэму хейту. У вас ёсць калонка ў адной з маладзёжных газет, дзе вы выступаеце са смелымі выказваннямі. Вы сутыкаецеся з хейтам з-за вашай палітычнай пазіцыі?***

— Асабліва сутыкнуўся з ім у 2020 годзе, калі выказваў сваю падтрымку дзеючай уладзе. Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі — класічны метад паліттэхналогій. Я выкладваў пасты — і ўжо праз 15-20 секунд пачыналася хваля хейту. Я быў да гэтага гатовы, таму ўспрымаў спакойна. Ад жывых зносін, асабліва ад знаёмых хейт — гэта іншая справа. Я ніколі нікога не крытыкаваў за палітычную пазіцыю, а дакладна, узважана выказваў сваю. Чалавек, які займаецца грамадскай дзейнасцю, павінен да хейту адносіцца спакойна, а да альтэрнатыўнага пункту гледжання прыслухоўвацца.

***— Выказваючы сваю палітычную пазіцыю ў 2020 годзе, вы страцілі сяброў, кантакты са знаёмымі?***

— Не. У мяне былі знаёмыя, якія мелі іншую пазіцыю, але яны не спрабавалі мне нешта навязаць. У мяне ёсць адзін прыяцель, які выказваўся не за ўладу і галасаваў адпаведна. Але ён разумеў, што «вуліца» нічога не вырашыць. Таму калі пачаліся пратэсты, іх не падтрымаў, а цяпер стаў заўзятым прыхільнікам улады.

***— Давайце пагаворым пра вашы захапленні, акрамя грамадскага жыцця. Чым напаўняеце вольны час?***

— Люблю дзейнасць, якая дазваляе «пераключацца». Па-першае, гэта спорт — веласіпед улетку, горныя лыжы зімой, басейн і прагулкі пешшу па Мінску ва ўсе поры года. Па-другое, люблю фільмы, сачу за навінкамі кінематографа. Магу нават назваць сябе кінаманам.

***— Ці можна вас сустрэць увечары ў бары ці кафэ?***

— Вядома, я лічу, што нічога тут асаблівага няма. Гэта адпачынак, які цябе перазагружае. Я часам бываю на нашых, як іх называюць, «тусовачных» вуліцах — Зыбіцкай, Кастрычніцкай. Там сустракаюся з сябрамі. Пра нас, маладых парламентарыяў, складваецца ўражанне, як пра кансерватыўных, адасобленых маладых людзей, але гэта не так.

***— Як вы адносіцеся да такога маладзёжнага трэнду як рэлакацыя?***

— Скептычна. Каб пераехаць, ты павінен мець навыкі, якія будуць карыснымі за мяжой. А калі іх няма і ты пераязджаеш, толькі каб пераехаць, не будзеш там запатрабаваны. Я заўсёды з гэтай нагоды прыводжу прыклад. У мяне быў знаёмы айцішнік, які зарабляў некалькі тысяч долараў. З'ехаў у Адэсу — і вярнуўся праз два месяцы. Тыя ўмовы, якія ствараюцца ў нас у кантэксце развіцця IT-сектара, лепшыя за еўрапейскія. Моладзь пераязджае за мяжу і думае, што будзе атрымліваць там дзясяткі тысяч долараў. Дык і траціць ты там будзеш шмат. Цяпер гляджу ў Тік-Ток, як нашы маладыя людзі, што папераязджалі ў Польшчу, улягаюць там практычна 24/7 і атрымліваюць капейкі. На мой погляд, у краіне створаны ўсе ўмовы для развіцця маладога чалавека.

***— Вы ў 2018-м ва ўзросце 21 года балаціраваліся ў Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў. У вас не атрымалася трапіць у яго склад. У будучым збіраецеся зноў паспрабаваць? Ці, можа, адразу ў парламент?***

— Мне гэта цікава. Не выключаю, што буду балаціравацца ў парламент або ў мясцовыя Саветы дэпутатаў у 2024 годзе. Я лічу, што магу быць карысны людзям. Нельга загадваць. Але я не бачу нічога дрэннага ў тым, калі ў наш парламент прыходзяць маладыя людзі. Яны заўсёды з'яўляюцца праваднікамі дзяржаўнай палітыкі для сваіх аднагодкаў. Гэта тая пераемнасць, пра якую кажуць нашы ўлады.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**Фота з архіва героя.**

Высокія тэхналогіі

# ПАЦЫЕНТКА ВЫПІСАНА, ЦЯЖАРНАСЦЬ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

## Беларускія медыкі сумесна з расійскімі калегамі зрабілі карэкцыю прыроджанага пароку развіцця

**Упершыню ў нашай краіне супрацоўнікі РНПЦ «Маці і дзіця» сумесна са спецыялістамі Нацыянальнага медыцынскага даследчага цэнтра акушэрства, гінекалогіі і перынаталогіі імя акадэміка У. І. Кулакова Міністэрства аховы здароўя Расіі выканалі высокатэхналагічную ўнутрычараўную карэкцыю прыроджанага пароку развіцця (ППР) плода — левабаковай дыяфрагмальнай грыжы.**



Аперацыйнае ўмяшанне правялі начальнік аддзела аказання меддапамогі Нацыянальнага медыцынскага даследчага цэнтра акушэрства, гінекалогіі і перынаталогіі імя акадэміка У. І. Кулакова, кандыдат медыцынскіх навук Юрый Набярэжнеў і загадчык акушэрскага фізіялагічнага аддзялення РНПЦ «Маці і дзіця» Максім Бялуга. Пра гэта паведаміла прэс-служба Міністэрства аховы здароўя.

Такая аперацыя выконваецца з мэтай лячэння выяўленай гіпаплазіі лёгкіх і, як вынік, прафілактыкі лёгачнай гіпертэнзіі. Паводле літаратурных даных, частата развіцця лёгачнай гіпертэнзіі ў постнатальным перыядзе дасягае 63 % і статыстычна карэлюе са смяротным зыходам у 62-93 % выпадкаў. Пры антэнатальным хірургічным лячэнні выжывае каля 70-80 % немаўлят.

Прыроджаны парок развіцця плода ў пацыенткі быў дыягнаставаны падчас прэнатальнага скрынінгу другога трыместра. Сям'я катэгарычна адмовілася ад перарывання цяжарнасці па медыка-генетычных паказаннях. У РНПЦ «Маці і дзіця» былі выкананы дадатковыя лабараторныя і інструментальныя даследаванні — магнітна-рэзанансная тамаграфія і ўльтрагукавое даследаванне. Паводле даследаванняў, у грудной клетцы плода злева размяшчаліся страўнік, петлі кішэчніка і доля печані са зрушэннем органаў направа. Суадносіны памераў лёгкага да акружнасці галоўкі плода складала 58 %, што сведчыла аб высокай рызыцы несспрыяльнага зыходу цяжарнасці. Перынатальным кансіліумам сям'і прапанавалі найскладанейшую аперацыю — фетаскапічную эндатрахеальную балонную аклюзію.

Пасля атрымання інфармаванай згоды на складанае медыцынскае ўмяшанне аперацыя была паспяхова выканана мультыдысцыплінарнай камандай урачоў-спецыялістаў 5 мая на тэрміне цяжарнасці 26 тыдняў.

Праз выгнуты аперацыйны тубус дыяметрам 3,3 мм у поласць маткі быў уведзены фетаскоп дыяметрам 1 мм. Пад фетаскапічным кантролем інструмент увялі ў трахею плода да ўзроўню біфуркацыі. Балон быў устаноўлены ад узроўню біфуркацыі трахеі да галасавой шчыліны. Пасляаперацыйных ускладненняў не зафіксавана. Далей праведзена лячэнне, накіраванае на захаванне цяжарнасці. Праз тыдзень (па даных УГД) плод развіваецца адпаведна з тэрмінам гестацыі, матачна-плацэнтарны кровазварот не парушаны, балон візуалізуецца ў трахеі плода. Цяжарнасць на дадзены момант працягваецца. Пацыентка ў здавальняючым стане выпісана дадому пад назіранне ўрача-акушэра-гінеколага.

Сітуацыя

# СААЗ даследуе ўспышку гепатыту ў дзяцей па ўсім свеце

**На працягу апошніх некалькіх тыдняў быў зарэгістраваны шэраг выпадкаў цяжкага гепатыту невядомага паходжання ў дзяцей. Выпадкі рэгістраваліся ў некалькіх краінах, у тым ліку ў Злучаным Каралеўстве Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі, Іспаніі і ЗША. Вось як тлумачаць незвычайную ўспышку ў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.**

**Што такое востры гепатыт?**

Гэта тэрмін, які азначае вострае запаленне печані. Востры гепатыт можа быць выкліканы як інфекцыяй, так і не звязанымі з інфекцыяй фактарамі. Існуюць тры асноўныя віды вострага віруснага гепатыту: гепатыт A, B і C. Вірусныя гепатыты D і E сустракаюцца радзей, асабліва ў краінах з высокім узроўнем даходу.

**Што робіць гэту ўспышку незвычайнай?**

Цяжкі востры гепатыт рэдка сустракаецца ў дзяцей ранняга ўзросту. Першыя паведамленні аб магчымым росце колькасці выпадкаў паступілі з Шатландыі. Пасля, па меры распаўсюджвання інфармацыі, трывожныя паведамленні сталі з'яўляцца і з іншых рэгіёнаў Злучанага Каралеўства, а таксама з іншых краін па ўсім свеце.

Вядома, што ў гэтых пацыентаў не былі выяўлены вірусы, якія звычайна становяцца прычынай вострага віруснага гепатыту. Па наяўнай на дадзены момант інфармацыі, міжнародныя паездкі або сувязь з іншымі краінамі таксама не ўказваюцца ў якасці фактараў, што маюць значэнне.

**Наколькі трывожнае становішча?**

Указаныя выпадкі — хоць яны і досыць рэдкія — варта ўспрымаць з усёй сур'ёзнасцю. Патрабуюцца далейшыя меры па выяўленні іншых патэнцыяльных выпадкаў, прычым не толькі ва ўжо закранутых краінах. Першачарговая задача заключаецца ў вызначэнні прычыны захворвання — для далейшага ўдакладнення мер па прафілактыцы і кантролі.

**Якія асноўныя тэорыі адносна паходжання?**

Мы цесна супрацоўнічаем з краінамі і партнёрамі дзеля пошуку магчымых тлумачэнняў. Вывучаецца шырокае кола мажлівых прычын. Па адной з асноўных гіпотэз, прычынай захворвання з'яўляецца адэнавірус. Гэта група распаўсюджаных вірусаў, якія могуць перадавацца ад чалавека да чалавека, і выклікаць сімптомы рэспіраторных захворванняў, ваніты і дыярэю ў дзяцей.

Разам з тым такая гіпотэза не можа ў поўнай меры растлумачыць цяжкія клінічныя праявы захворвання. Вядомыя выпадкі гепатыту, выкліканага адэнавіруснай інфекцыяй, у дзяцей з аслабленай імуннай сістэмай, але пры гэтым раней адэнавірусная інфекцыя не станавілася прычынай гепатыту ў здаровых дзяцей.

Група спецыялістаў са Злучанага Каралеўства назвала ў якасці магчымых фактараў павышаную ўспрымальнасць дзяцей ранняга ўзросту да адэнавіруснай інфекцыі з прычыны нізкага ўзроўню цыркуляцыі адэнавірусаў падчас пандэміі COVID-19 альбо патэнцыяльнае з'яўленне новага адэнавіруса, альбо спалучаную інфекцыю адэнавіруса і віруса SARS-CoV-2. Гэтыя гіпотэзы маюць патрэбу ў далейшым вывучэнні.

**Ці можа ўспышка быць звязана з COVID-19 і вакцынацыяй?**

У некалькіх выпадках было выяўлена заражэнне вірусам SARS-CoV-2. У той жа час на дадзены момант у шматлікіх закранутых успышкай краінах назіраецца шырокая цыркуляцыя COVID-19, і патэнцыяльная роля віруса SARS-CoV-2 у цяперашняй клінічнай карціне незразумелая.

Зараз няма фактычных даных, якія пацвярджалі б сувязь клінічнай карціны з вакцынацыяй, паколькі большасць хворых дзяцей не была вакцынавана супраць COVID-19. Для ацэнкі і кантролю рызыкі неабходна дэталёва вывучыць шэраг іншых магчымых фактараў інфекцыйнага і неінфекцыйнага характару.

**Ці варта чакаць з'яўлення новых выпадкаў?**

Паведамленні аб новых выпадках працягваюць паступаць, прымаюцца пашыраныя меры па выяўленні выпадкаў у іншых краінах. У сувязі з гэтым вельмі верагодным бачыцца выяўленне новых выпадкаў яшчэ да таго, як будзе ўстаноўлена прычына захворвання і будуць адпаведным чынам скарэктаваны меры па яго прафілактыцы і кантролі.

**На што трэба звярнуць увагу бацькам?**

Найперш неабходна адзначыць, што дадзенае захворванне не з'яўляецца распаўсюджаным. Аднак бацькі павінны звяртаць увагу на сімптомы гепатыту — вострую дыярэю, ваніты, боль у жываце і жаўтуху (пажаўценне скуры і бялкоў вачэй) — у дзяцей. У большасці захварэлых не адзначалася павышэння тэмпературы. Пры ўзнікненні нагод для занепакоенасці бацькам рэкамендуецца звяртацца да медыцынскіх работнікаў.

**Што можна зрабіць, каб засцерагчы дзяцей?**

Трэба праводзіць звычайныя меры па засцярозе ад вірусаў: забяспечыць правільнае мыццё рук і належную рэспіраторную гігіену (прыкрываць рот падчас кашлю і чхання і іншае).

Карысна ведаць

# Калі блізкі мае душэўную хваробу...

**Псіхічнае захворванне прыносіць пакуты не толькі хвораму, але і яго родным, у большай ці меншай ступені закранаючы ўсіх членаў сям'і, змяняючы іх жыццё, планы на будучыню і адносіны паміж імі. Пацыенту неабходныя дапамога і падтрымка ўсёй сям'і. Даўно вядома, што адносіны ў сям'і могуць уплываць на ход захворвання, спрыяць ці перашкаджаць паляпшэнню стану, так і яго пагаршэнню.**



### ДОЎГІ ШЛЯХ, ЯКІ ВАРТА ПРАЙСЦІ РАЗАМ

Без усведамлення, што блізкі чалавек хворы, жыццё ўсёй сям'і ператвараецца ў суцэльнае пекла, падкрэслівае **псіхолаг сталічнага клінічнага псіхіятрычнага диспансера Наталля СТАТКЕВІЧ.**

— Першае, што трэба ведаць і заўсёды памятаць, маючы зносіны з псіхічна хворым чалавекам (усё роўна, якая хвароба) — гэта тое, што яго эмоцыі адрозніваюцца ад тых, што адчувае здаровы чалавек. Каб хоць крыху зразумець, наколькі зніжаны эмоцыі ў псіхічна хворых людзей, успомніце сябе ў самыя цяжкія хвіліны смутку, калі нічога не хочацца, адно жаданне — забіцца ў кут, схавацца ад рэальнага жыцця. У псіхічна хворых людзей з'яўляецца свой свет, адбываецца сыход у сябе, надыходзіць нейкае атупенне, памяншаецца адчуванне прыхільнасці і нават любові да тых, хто раней быў дарагі, — тлумачыць псіхолаг.

Таму самае важнае для сваякоў — зразумець, што псіхічнае захворванне — гэта не ангіна і не галаўны боль, якія пры медыкаментозным лячэнні хутка пройдуць. Псіхічнае захворванне — працяглы шлях, які трэба праходзіць разам. Тут важнае медыкаментознае і псіхатэрапеўтычнае лячэнне. Але яно не зможа прынесці карысць і рэмісію без падтрымкі блізкіх, без ведання пабудовы правільных зносін з хворым. Людзі з псіхічным захворваннем павінны разумець, што, нягледзячы на магчымасць рэцыдываў, нягледзячы на тое, што не ўсе спрамы ў жыцці ім даступныя, яны вартыя павагі і прызнання. Таму, прымаючы хваробу роднага чалавека, праяўляючы павагу да яго, вы ступаеце на доўгі шлях, які будзеце праходзіць з ім разам.

### ДАВЕДАЙЦЕСЯ ПРА ХВАРОБУ БОЛЬШ

Для таго каб глыбей зразумець, што з вашым блізкім адбываецца, неабходна ведаць сімптомы, характэрныя для дадзенага псіхічнага захворвання.

Вось тут і спатрэбяцца псіхаадукацыйныя праграмы і кансультацыі для сваякоў ва ўстанове, дзе знаходзіцца на ўліку ваш блізкі. Ведаючы сімптомы яго псіхічнага захворвання, будзе лягчэй ацаніць, што з ім адбываецца і як яму дапамагчы.

**НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПРАВІЛЫ ЗНОСІН:**

1. Самае важнае — павага, стаўцеся да хворага чалавека як да здаровага.
2. Будзьце паслядоўныя, спакойныя, дакладныя і адкрытыя.
3. Не забывайце, што чалавек хворы і часам не можа вас зразумець. Не зрывайцеся на эмоцыі і не даказвайце яму нічога.
4. Захоўвайце пазітыўны настрой нават пры няўдачах.
5. Заўважайце самыя маленькія станоўчыя зрухі. Акцэнтуйце ўвагу на пазітыўным. Людзі, якія маюць псіхічныя расстройствы, і так псіхалагічна пакутуюць.
6. Заўвагі павінны быць канкрэтнымі і па сутнасці ў дадзены момант часу.
7. Дапамагайце захоўваць годнасць чалавеку. Не стаўце на ім кляймо і не патрабуйце ад яго больш, чым ён можа. Усё дасягаецца маленькімі крокамі.
8. Дапамагайце будаваць яму кароткатэрміновыя мэты. У доўгатэрміновых няма сэнсу.
9. Вельмі важна планаваць дзень. Дапамагайце яму, улічваючы стан.
10. Уцягвайце хворага ў сацыяльнае жыццё. Не давайце яму магчымасці закрыцца і адгарадзіцца ад соцыуму.
11. Не трэба адцягваць чалавека ад камп'ютара, распавядаючы аб шкодзе выпраменьвання. Хвораму чалавеку часам працай пісаць, чым выбудоўваць свае думкі з дапамогай слоў. Многім псіхічна хворым людзям нашмат працей весці зносіны віртуальна.
12. Нельга казаць хвораму «я зараз выклічу табе перавозку». Гэта трымае ў страшным напружанні. Ён баіцца штосьці рабіць, часам нават зрабіць крок. І, натуральна, страчваецца давер да вас.

Гэта невялікая колькасць правілаў, аднак яны найважнейшыя. Розныя псіхічныя захворванні развіваюцца па-рознаму, таму і правілы будуць адрознівацца. Высвятліць, якія з іх найбольш падыходзяць для канкрэтнага чалавека, можна толькі шляхам спроб і памылак. Галоўнае, каб памылкі не нанеслі шкоды ні вам, ні хвораму.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

18 мая 2022 г. № 18 (654)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


# ГАЛОЎНАЕ — ГЭТА ЛЮДЗІ

## У Докшыцах абмяркоўвалі, што рабіць з пустымі дамамі і як выконваць сацыяльныя стандарты





Фота БелТА.



Перад пасяджэннем Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава наведала вёску Свіркі, дзе пацікавілася, як выкарыстоўваюць землі, якія вызваляюцца пасля зносу нікому не патрэбнага жылля. Пра гэта расказаў старшыня Параф'янаўскага сельскага Савета Валерый Навумчык. У вёсцы Свіркі засталося 34 хаты, толькі ў 19 з іх людзі жывуць пастаянна, пяць хат адведзены пад дачы. У гэтым годзе работнікі Докшыцкага райаграсэрвісу знеслі пустыя хаты на шасці ўчастках. У суме каля 2,2 гектара зямлі ўвялі ў абарот. Тут ужо засеяны сельскагаспадарчыя культуры. Таксама мясцовым жыхарам прапаноўваюць набыць дадатковыя соткі ці прадаць зямлю пад будаўніцтва. Дзякуючы Указу № 116 «Аб адчужэнні жылых дамоў у сельскай мясцовасці і ўдасканаленні работы з пустымі дамамі» такую работу мясцовыя органы ўлады могуць праводзіць у больш кароткія тэрміны.

Наталля Качанава звярнула ўвагу, што сёння сярод маладога пакалення назіраецца трэнд — вяртацца на малую радзіму, купляць зямельныя ўчасткі не для вядзення гаспадаркі, а для камфортнага адпачынку. На яе меркаванне, такія вёскі, як Свіркі, могуць прыцягваць маладыя сем'і як месца, дзе можна бюджэтна пабудаваць летні домік.



**У Докшыцкім раёне прайшло пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі. На парадку дня — самыя актуальныя для рэгіёна пытанні. У прыватнасці, работа мясцовых органаў улады па рэалізацыі мер, накіраваных на ўстойлівае развіццё тэрыторый, рэалізацыя сістэмы дзяржаўных сацыяльных стандартаў у рэгіёне. Удзельнікі пасяджэння таксама абмеркавалі падыходы да развіцця рэгіёнаў, закладзеныя ў Канцэпцыі дзяржаўнай палітыкі рэгіянальнага развіцця Рэспублікі Беларусь.**

«Сёння мы абмяркуем, як зараз рэалізоўваюцца тыя задачы, якія пастаўлены Прэзідэнтам нашай краіны і вызначаны VI Усебеларускім народным сходам. Кіраўніком дзяржавы яшчэ ў 2006 годзе быў прыняты ўказ аб рабоце з пустымі і састарэлымі будынкамі і дамамі, у які тройчы ўносіліся змяненні і дапаўненні», — сказала **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА**. Яна пацікавілася, як рэалізоўваецца прыняты ў 2021 годзе Указ № 116, што зроблена за гэты час і наколькі ўказ дапамагае мясцовым уладам вырашаць праблемы, звязаныя са старымі і пустымі дамамі.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што ад таго, як працуюць на месцах кіраўнікі сельсаветаў, гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў, шмат у чым залежыць камфортнае жыццё нашых грамадзян.

Важнай тэмай для абмеркавання стала выкананне дзяржаўных сацыяльных стандартаў. «У розных рэгіёнах сітуацыя складваецца па-рознаму. Дзесьці ёсць праблема з забяспечанасцю якаснай пітной вадой, дзесьці трэба вырашыць пытанне рамонту дарог. Функцыянал членаў Савета Рэспублікі — працаваць з тэрытарыяльнымі органамі мясцовага самакіравання, кіравання, бо мы, прымаючы законы, павінны ведаць, як развіваюцца рэгіёны. Мы разглядаем актуальныя пытанні кожнага канкрэтнага рэгіёна. Ведаючы праблему, мы разумеем, як давесці яе да лагічнага вырашэння. Мы паглядзелі, як рэалізоўваюцца дзяржаўныя стандарты на месцах, што вельмі важна. У іх вызначаны ўсе кірункі жыццядзейнасці чалавека. Работа з насельніцтвам — асноватворны складнік нашай працы і вялікая дапамога для яе», — адзначыла Наталля Качанава.

Старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Субоцін расказаў, што ў рэгіёне для павышэння якасці жыцця адкрываюцца новыя вытворчасці, рэалізоўваюцца інвестпраекты, ствараюцца індустрыяльныя пляцоўкі і тэхнапаркі.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу, што не ўсё залежыць ад спрыяльных матэрыяльных умоў, якія ствараюцца для маладой працоўнай змены. «Развіваючы раўнамерна рэгіёны, ствараючы прадпрыемствы, адкрываючы філіялы прадпрыемстваў, мы бачым, што за гэтым будучыня. Тады маладыя людзі могуць заставацца на малой радзіме, працаваць там, дзе нарадзіліся ці дзе ім стварылі камфортныя ўмовы. Аднак для моладзі важны патрыятызм — а гэта любоў да Радзімы, сям'і, сваёй зямлі. І гэтая аснова сапраўднага грамадзяніна закладваецца і засвойваецца яшчэ ў дзяцінстве», — падкрэсліла яна.

Наталля Качанава канстатавала, што адыходзіць ад дзяржаўных сацыяльных стандартаў у рэгіёне нельга. І кіраўнікі кожнай вобласці павінны кантраляваць сітуацыю, якая складваецца па асноўных напрамках жыццядзейнасці кожнага раёна, горада ці вёскі. «Самае галоўнае, як вызначае Прэзідэнт, — развіццё нашай краіны на карысць нашых людзей. Галоўнае — гэта людзі. Людзі з іх праблемамі, з іх пытаннямі, з вырашэннямі тых задач, якія перад намі ставіць жыццё», — заўважыла яна.

Пасля пасяджэння ў размове з журналістамі Наталля Качанава падкрэсліла: работа на месцах з людзьмі — асноватворнае. «Гэта вялікая дапамога і дапамога для нас — дэпутацкага корпуса любога ўзроўню, няхай гэта будуць сельскія Саветы або Савет Рэспублікі. Мы ўсе павінны працаваць з людзьмі, таму што надалей зможам разумець, наколькі правільныя і апраўданыя рашэнні, у тым ліку заканадаўчыя, мы прымаем. Таму такія выязныя пасяджэнні, у якіх удзельнічаюць прадстаўнікі ўсіх узроўняў дэпутацкага корпуса, — абсалютна апраўданая праца», — канстатавала яна.

---

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Жыццё сталіцы і рэгіёнаў, ахова здароўя і звароты грамадзян

**Расказваем галоўныя навіны мінулага тыдня з Савета Рэспублікі**

Пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай прайшло пасяджэнне экспертнага савета. На парадак дня было вынесена пытанне прававога рэгулявання работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.

«Любы дзяржаўны орган працуе са зваротамі. Для Савета Рэспублікі як палаты тэрытарыяльнага прадстаўніцтва работа са зваротамі — адзін з прыярытэтаў. Мы нясём адказнасць за якасць жыцця людзей па ўсёй краіне, за сацыяльнае самаадчуванне рэгіёнаў, а значыць, абавязаны ўключацца ў вырашэнне праблем нашых грамадзян. Таму для нас гэтае пытанне вельмі важнае», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Сярод экспертаў — члены Савета Рэспублікі, якія працуюць у рэгіёнах і маюць вялікі вопыт непасрэднай работы са зваротамі. Удзельнікі пасяджэння адзначылі, што рэдакцыя Закона «Аб звароце грамадзян і юрыдычных асоб» з 2015 года значна не мянялася. За гэты час было назапашана дастаткова вопыту, каб уносіць прапановы аб удасканаленні дзеючых палажэнняў. Карэкціроўкі патрабуе, у прыватнасці, парадак падачы і ў цэлым работа з электроннымі зваротамі, выкарыстанне грамадзянамі падчас прыёму тэхнічных сродкаў, вядзенне кнігі заўваг і прапаноў і некаторыя іншыя пытанні.

Асаблівую ўвагу эксперты ўдзялілі магчымаму злоўжыванню правам на зварот. Ужо былі выпадкі, калі грамадзяне накіроўвалі ў розныя інстанцыі пісьмы, дабіваючыся рашэння праблемы на сваю карысць, і не хацелі слухаць, што кажа пра гэта закон.

Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны Прэзідэнта па горадзе Мінску Наталля Качанава правяла нараду з кіраўніцтвам сталіцы і яе раёнаў. На традыцыйную сустрэчу былі запрошаны памочнік Прэзідэнта па Мінску Аляксандр Барсукоў, упаўнаважаны па Мінску Іван Кубракоў, старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў, кіраўнікі адміністрацый сталічных раёнаў і іх намеснікі, якія курыруюць сацыяльную сферу. На парадак дня былі вынесены актуальныя пытанні жыццядзейнасці сталіцы, якія ўзнімаліся на дакладзе ў Прэзідэнта 6 мая: добраўпарадкаванне, інвестпраекты, развіццё сістэмы аховы здароўя, удасканаленне мясцовага самакіравання. Асобна Наталля Качанава звярнула ўвагу на ідэалагічную работу. «Патрабаванні да тых людзей, якія займаюцца і будуць займацца пытаннямі ідэалогіі, узрастаюць кратна. У нас сёння дакладна выбудавана кіраўнічая вертыкаль у горадзе. Укамплектаванасць ідэалагічнымі кадрамі поўная. Ваша праца павінна быць бачная. Гэта тое, аб чым заўсёды гаворыць наш Прэзідэнт».

Наталля Качанава правяла чарговую селектарную нараду з прадстаўнікамі Міністэрства аховы здароўя і ўстаноў аховы здароўя Мінска. Спецыялісты паведамілі, што сёння інфекцыйнае становішча дастаткова спакойнае, паліклінікі і бальніцы працуюць у штатным рэжыме. Таму парадак дня ў большай ступені быў прысвечаны бягучай дзейнасці сістэмы аховы здароўя. У прыватнасці, абмяркоўваліся пытанні, якія датычацца работы ложкавага фонду, амбулаторнага звяна, забеспячэння лекавымі сродкамі, паставак вырабаў медпрызначэння, рамонту абсталявання. Асобная ўвага была ўдзелена пытанню чэргаў на аказанне розных відаў медыцынскай дапамогі, уключаючы высокатэхналагічную.

Старшыня Савета Рэспублікі правяла нараду з намеснікамі старшынь абласных выканаўчых камітэтаў. У цэнтры ўвагі — развіццё сацыяльнай сферы, у тым ліку ідэалагічная работа ў працоўных калектывах, з насельніцтвам па месцы жыхарства.

**Матэрыялы падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# СЛУЖЫЦЬ КРАІНЕ, НАРОДУ, ДЗЯРЖАВЕ

**На чарговым пасяджэнні восьмай сесіі Савета Рэспублікі сенатары адобрылі шэраг законапраектаў. У цэнтры ўвагі — дакументы, якія датычацца дзяржаўнай службы і міжнароднага супрацоўніцтва.**

Сенатары адобрылі законапраект аб дзяржаўнай службе. Як адзначыла **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ**, Інстытут прафесійнай дзяржаўнай службы, створаны ў 1993 годзе, сёння дзейнічае на падставе закона 2003 года. «Выбудаваная ў нашай краіне мадэль дзяржаўнай службы дае магчымасць вырашаць асноўныя яе задачы. Разам з тым дзейны каля 20 гадоў практычна ў нязменным выглядзе закон аб дзяржслужбе мае патрэбу ў пераглядзе як з улікам практыкі яго прымянення, так і ў сувязі з неабходнасцю вызначыць новыя перспектыўныя напрамкі развіцця Інстытута дзяржаўнай службы ў сацыяльных і эканамічных умовах, што змяніліся», — сказала яна. Гэты законапраект падрыхтаваны па даручэнні кіраўніка дзяржавы. Яго галоўнай мэтай Ірына Касцевіч назвала павышэнне эфектыўнасці дзяржаўнага кіравання.

«У дакуменце замацаваны дакладныя і вычарпальныя патрабаванні да праходжання дзяржаўнай службы, вызначаны абавязкі, правы і сацыяльна-прававыя гарантыі дзяржаўных служачых», — адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ**.

Законапраект замацоўвае цэласную сістэму дзяржаўнай службы, якая складаецца з дзяржаўнай грамадзянскай службы, ваеннай службы, службы ў ваенізаваных арганізацыях, а таксама агульныя для ўсіх дзяржаўных служачых нормы, што вызначаюць прынцыпы дзяржаўнай службы і паняцці. Уводзіцца рэестр дзяржаўных грамадзянскіх пасад і ўдасканальваецца сістэма класаў дзяржслужачых. Узмацняюцца дысцыпліна і адказнасць грамадзянскіх служачых у мэтах зніжэння іх прававога статусу з вайскоўцамі. Мяркуецца, што гэты законапраект паспрыяе павышэнню прэстыжу дзяржаўнай службы і статусу дзяржаўнага служачага. Ён дапаможа захаваць у дзяржаўным апараце найлепшых спецыялістаў і дадаткова прыцягнуць прафесійных і ініцыятыўных спецыялістаў.

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** звярнула ўвагу, што работа над гэтым законапраектам працягвалася чатыры гады. Тройчы падыходы разглядаліся на нарадзе ў Прэзідэнта. «Людзі, якія прыходзяць на дзяржаўную службу, павінны разумець, што яны служаць краіне, народу, дзяржаве. Таму гэта вельмі важны законапраект, на мой погляд, каб сёння людзі, якія маюць уладныя паўнамоцтвы, былі адданыя свайму народу і краіне. Гэта абсалютна правільны падыход», — канстатавала Наталля Качанава.

## Супрацоўніцтва з Арменіяй

Сенатары таксама адобрылі законапраект «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Арменія аб рэадмісіі». **Міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ** падкрэсліў, што адзін з найбольш эфектыўных і перспектыўных інструментаў у сферы процідзеяння нелегальнай міграцыі — выкарыстанне такой формы прымусовага вяртання мігрантаў, як рэадмісія. «Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Арменія аб рэадмісіі» падпісана ў Мінску 8 кастрычніка 2021 года. Пагадненне прадугледжвае ўзаемныя абавязацельствы Беларусі і Арменіі па запыце аднаго з бакоў прымаць уласных грамадзян, грамадзян трэціх краін і асоб без грамадзянства, якія выехалі або знаходзяцца на тэрыторыі дзяржавы, якая запытвае, з парушэннем міграцыйных правілаў гэтай дзяржавы», — расказаў міністр.

Адказнымі за рэалізацыю законапраекта вызначаюцца Міністэрства ўнутраных спраў і Дзяржаўны пагранічны камітэт ад Рэспублікі Беларусь. Ад Рэспублікі Арменія такімі органамі прызначаюцца Міграцыйная служба Міністэрства тэрытарыяльнага кіравання і інфраструктур.

Таксама сенатарамі адобраны законапраект «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні дапаўнення ў Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Арменія аб узаемных бязвізавых паездках грамадзян Рэспублікі Беларусь і грамадзян Рэспублікі Арменія».

«Мяркуецца, што законапраект будзе садзейнічаць развіццю і ўмацаванню двухбаковага супрацоўніцтва ў галіне палітычных, эканамічных, гаспадарчых, навуковых, гуманітарных і культурных сувязяў паміж Беларуссю і Арменіяй. Прыняцце законапраекта дасць магчымасць павялічыць турыстычны паток паміж краінамі. Законапраект адпавядае інтарэсам нашых грамадзян», — заўважыў **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ**.

Таксама падчас пасяджэння восьмай сесіі Наталля Качанава ўручыла членам Савета Рэспублікі юбілейныя медалі «МПА СНД. 30 гадоў». Андрэй Іванец, міністр адукацыі, і Эльвіра Сарока, член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, былі ўзнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

ІДЭІ І ЎВАСАБЛЕННЕ

# КАЛІ НЕ Я, ТО — МЫ!

**На Гомельшчыне дэпутаты прапануюць разам вучыцца, як дапамагчы развіццю тэрыторыі сваёй малой радзімы.**

Гомельская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў упершыню арганізавала практычнае навучанне па асновах праектнага менеджменту для актывістаў з розных раёнаў рэгіёна.

На семінары-трэнінгу ў Гомелі сабраліся супрацоўнікі сельвыканкамаў, устаноў культуры, адукацыі і тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. У сустрэчы ад імя актывістаў свайго раёна ўзяла ўдзел **старшыня Буда-Кашалёўскага раённага Савета дэпутатаў Наталля КІСЯЛЁВА:**

— Ідэй у нашых людзей вельмі шмат, і важна тое, што іх ёсць з кім увасабляць у жыццё. Не згодная, калі гавораць, што ў нас не так развіта праектная дзейнасць у плане мясцовых ініцыятыў. Проста людзі часта ўласныя ідэі, мары па паляпшэнні жыцця на сваёй тэрыторыі рэалізуюць без праектаў, без пэўных грантаў. Мы не ўмеем і, калі можна так сказаць, хваліцца, правільна прэзентаваць паспяховую работу, якую праводзім на месцах, але вучымся!

Сваімі ўражаннямі ад удзелу ў трэнінгу старшыня Буда-Кашалёўскага райсавета падзялілася падчас перапынку ў занятках. Праграма насычаная і вельмі цікавая на падачы, адзначае Наталля Кісялёва. Дэпутат упэўненая, што веды, атрыманыя падчас трэнінгу, дазволяць ёй больш якасна пабудаваць работу па праектных ініцыятывах у сельсаветах.



Адкрыццё скейт-пляцоўкі ў Дзень горада ў Ветцы, што натхніла гараджан на новы сацыяльна значны праект.

— На тэрыторыі нашага ёсць таксама прыклад актыўнай тэрыторыі — аграгарадок Уваравічы. Толькі за апошнія гады там асцыявілі адразу некалькі сацыяльна значных праектаў, якія дазволілі не толькі павысіць узровень жыцця вяскоўцаў, але, лічу, і паспрыялі замацаванню моладзі на вёсцы.

Ва Уваравічах уладкавалі спартыўны гарадок, добраўпарадкавалі бегавыя дарожкі на стадыёне. Са школьнага спартыўнага пакою, які быў аснашчаны толькі самаробнымі трэнажорамі, зрабілі сучасны спартаб'ект для вяскоўцаў аграгарадка ўсіх узростаў.

— Таксама ў школе быў абсталяваны інфармацыйны цэнтр. Цяпер гэта любімая прастора не толькі для правядзення школьных мерапрыемстваў, але і любых вясковых свят, афіцыйных сустрэч.

Досвед работы з вясковымі актывістамі даказаў, адзначае дэпутацкі лідар Буда-Кашалёўшчыны: поспех у ініцыятывах абавязкова прыходзіць, калі ў людзей ёсць усведамленне, што сельвыканкам падтрымае, акажа дапамогу і зможа шчыра парадавацца, што неважна, поспеху ініцыятывы.

— Падобны семінар-трэнінг па асновах праектнага менеджменту дае магчымасць неабыякавым жыхарам раёнаў — калі хочаце, фанатам развіцця сваёй малой радзімы — разабрацца, як напісаць праект, заявіцца з ім, і як зрабіць так, каб перамагчы ў конкурсе ініцыятыў у рэгіёне. Лічу, што гэта таксама важны



Супрацоўнікі сельвыканкамаў, устаноў культуры, адукацыі і тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва з розных куткоў Гомельшчыны на семінары-трэнінгу ў Гомелі.

псіхалагічны момант, які матывуе, — падкрэслівае Наталля Кісялёва.

Цікавым і пазнавальным семінар-трэнінг падаўся яго ўдзельнікам, у якіх ужо быў вопыт праектнай дзейнасці па ажыццяўленні сацыяльных праектаў.

**Завуч па выхаваўчай рабоце Веткаўскай сярэдняй школы № 1 імя А. А. Грамыкі Яна ІСАЧАНКА** падзялілася, што асабліва каштоўная для яе і яе калег магчымасць абмеркаваць з дасведчаным спецыялістам новыя ідэі. Дарэчы, менавіта жыхары Веткаўшчыны аказаліся самымі актыўнымі на праведзеным упершыню конкурсе на найлепшы сацыяльны праект Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Веткаўчане прапанавалі на конкурс адразу 13 ініцыятыў, з якіх дзве былі прызнаны пераможцамі ў рэгіёне. Абодва праекты распрацавалі менавіта ў Веткаўскай сярэдняй школы № 1 імя А. А. Грамыкі.

— Сістэма адукацыі, мы ўпэўнены, — гэта не толькі школа ці дзіцячы садок. Наша мара — адукацыя павінна праходзіць праз усё жыццё чалавека. Імкнуліся стварыць у сваім райцэнтры адукацыйны цэнтр для людзей усіх узростаў, — тлумачыць Яна Ісачанка. — Гэтай мэце прысвечаны наш праект «Клуб здароўя» для жыхароў Веткі ва ўзросце 60+.

Завуч па выхаваўчай рабоце Веткаўскай сярэдняй школы № 1 імя А. А. Грамыкі расказала, што да тэрыторыі іх установы прылягаюць цудоўны парк і сажалка, добраўпарадкаванню якіх кіраўніцтва раёна ўдзяляе вялікую ўвагу.

— Гэтае месца найбольш папулярнае сярод людзей трэцяга ўзросту. Стварэнне клуба дазволіць пажылым людзям не толькі забяспечыць клопат аб сваім здароўі пад кіраўніцтвам кваліфікаваных спецыялістаў: будуць распрацаваны курсы па скандынаўскай хадзьбе і фітнесе, але і створыць умовы для развіцця сацыякультурнага асяроддзя. Мы матывуем іх да нефармальных зносін, як адзін з адным, так і з моладдзю, дасведчанымі спецыялістамі, якія будуць працаваць у гэтым клубе.

Другая ідэя жыхароў Веткі, якая перамагла ў конкурсе на найлепшы сацыяльны праект Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, — развіццё варкаўт-руху сярод моладзі.

— Горад летась падарыў нам сучасную скейт-пляцоўку, — дадае ўдзельніца семінара-трэнінгу, **галоўны спецыяліст аддзела адукацыі, спорту і турызму Веткаўскага райвыканкама Вераніка ЯРМАК**. — Наша ідэя — яе яшчэ больш удасканаліць, каб у дзяцей было болей магчымасцяў развівацца ў любімым відзе спорту.

Падобнае практычнае навучанне па асновах праектнага менеджменту для актывістаў раёнаў Гомельшчыны было арганізавана таксама ў Мазыры. Удзельнікам трэнінгаў прапанавалі ў групах па зададзеным алгарытме папрацаваць над напісаннем канцэпцыі ініцыятывы. Кожны змог выступіць з прэзентацыяй праекта па развіцці тэрыторыі сваёй малой радзімы.

— Спадзяёмся, што ўдзельнікі трэнінгаў атрымалі багаж ведаў па праектнай дзейнасці, які ў будучыні дапаможа ім распрацаваць і рэалізаваць праект на тэрыторыі Гомельшчыны, — падкрэсліла **старшыня праўлення Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА**.

Як зазначыла дэпутат, Гомельская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў працягвае актыўную работу па заахвочванні жыхароў населеных пунктаў да ўключэння ў грамадзянскія ініцыятывы, накіраваныя на паляпшэнне якасці жыццядзейнасці людзей, добраўпарадкаванне тэрыторый.

— У праектах-ідэях, якія мараць рэалізаваць актывісты, улічваецца актуальнасць ініцыятывы, прадуманасць і паслядоўнасць дзеянняў па яе ажыццяўленні, чаканы сацыяльны, эканамічны і экалагічны эфект, устойлівасць і развіццё атрыманых вынікаў, — дадала Вікторыя Ладуцька.

Як вядома, на першы ў рэгіёне конкурс Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў на найлепшы сацыяльны праект, абвешчаны летась, было даслана 68 праектаў, 18 работ прызнана пераможцамі і ўзята да рэалізацыі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара і БелТА.**

# СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ АДНАГО СЕЛЬСАВЕТА

## Ёсць праекты, якія не патрабуюць укладанняў сродкаў, а толькі ўвагі і настойлівасці

**Да аграгарадка Міханавічы ад Мінска — рукой падаць. Паўгадзіны электрычкай або маршруткай — і гасцей сустракае населены пункт ва ўсёй сваёй прыгажосці: добраўпарадкаваны, чысты, утульны. А на вуліцы Садовай знаходзіцца, як кажуць месцічы, галоўны штаб — будынак Міханавіцкага сельвыканкама, які ўзначальвае Святлана ДАВАЛЬЦОВА. Сюды я і спяшаюся. Як аказалася, Святлану Уладзіміраўну заспела ў апошні момант, яна збіралася ехаць па справах, але пагадзілася расказаць пра змены, што адбыліся ў аграгарадку, паказаць новыя аб'екты.**

— Міханавіцкі сельсавет раскінуўся на 10 тысячах гектараў. У яго склад уваходзяць 15 вёсак, два аграгарадкі — Міханавічы і Чурылавічы. Цэнтр сельсавета — аграгарадок Міханавічы. У сярэднім тут пастаянна пражывае больш за 10 тысяч чалавек, у тым ліку дзве тысячы дзяцей, — па дарозе расказала Святлана Давальцова. — Наш сельсавет адзін з нямногіх, дзе развіты і аграрны, і прамысловы комплекс. Тут налічваецца больш як 100 суб'ектаў гаспадарання рознай формы ўласнасці.

### Рэгіянальная канцэпцыя

Паступова размова пераходзіць да тэмы рэгіянальнага развіцця.

Настаў час, што кожны населены пункт павінен будаваць стратэгію свайго развіцця з улікам асаблівасцяў рэгіёна. Па меркаванні Святланы Давальцовай, рэгіянальнасць — гэта тое, што кожны сельсавет укладвае ў асноўную ідэю, спецыфіку, стратэгію.

— Асаблівасць Мінскага раёна — тэмп і дынаміка развіцця па ўсіх кірунках адначасова: будаўнічым, сацыяльным, вытворчым. І калі аб'яднаць пажаданні насельніцтва прысталічча адным словам, то ў большасці людзі хочуць жыць у сельскай мясцовасці, але з гарадскімі ўмовамі. У аграгарадках Мінскага раёна гэта магчыма. Але, каб пастаянна трымаць тэмп, патрэбна канцэпцыя развіцця населенага пункта, пажадана падмацаваная генеральным планам. Кожны сельсавет павінен дакладна вызначыць канцэпцыю развіцця ад трох да пяці гадоў наперад. Толькі тады разумееш, што кожны дзень, месяц працуеш на гэтую канцэпцыю. Напрыклад, хоць бы гадзіну штодня павінен адысці ад паўсядзённых спраў, удзяліць увагу канцэпцыі, якая для цябе нібыта настольны каляндар. Штодзень трэба рабіць задзел на будучыню, — лічыць Святлана Давальцова.

### Для аздараўлення і выхавання

У Міханавіцкім сельсавеце свая, адрозная ад іншых, канцэпцыя. Але пра гэта пазней.

А пакуль непрыкметна пад'язджаем да фізкультурна-аздараўленчага комплексу «Кіт» (ФАК). Гэты прыгожы будынак быў адкрыты сёлета — 14 студзеня.

— Мы вырашылі, што комплекс павінен стаць не толькі месцам аздараўлення для дзяцей, але і выхаваўчым, культурным цэнтрам для падрастаючага пакалення, выдзяляцца яркімі мерапрыемствамі. У прыватнасці, разам з прадстаўнікамі культуры, адукацыі, дашкольных устаноў абмяркоўваем пытанне, як найлепшым чынам арганізаваць тут свята для малых у Міжнародны дзень абароны дзяцей першага чэрвеня, з разнастайнымі конкурсамі, выступленнем казачных персанажаў, інтэрактыўнымі пляцоўкамі, песнямі, танцамі, сямейнымі спартакіядамі. Гэта павінен быць дзень сонца, гульняў. Раней гэты дзень кожная ўстанова адзначала паасобку. Цяпер такое свята мы маем намер зрабіць штогадовым, традыцыйным. Дзеці павінны разумець, што гэты прыгожы сучасны будынак для іх, для іх фізічнага развіцця, здароўя, — выказвае меркаванне Святлана Давальцова.



Фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Кіт».




Старшыня сельвыканкама Святлана ДАВАЛЬЦОВА знаёміць з канцэпцыяй развіцця аграгарадка.

Варта дадаць, што комплекс прызначаны для аздараўлення не толькі дзяцей, але і людзей з абмежаванымі магчымасцямі, пажылых. І наогул усіх ахвотных. Як кажуць, лепш хваробу папярэдзіць, чым лячыць.

Сімвалічна, што насупраць ФАКа ўжо запланавана пляцоўка для будаўніцтва аднаўленча-рэабілітацыйнага цэнтра са змешанай паліклінікай. Гэта вельмі актуальна для людзей, якія перанеслі каранавірус. Медыцынскую ўстанову будуць наведваць не толькі жыхары Міханавіч і сельсавета, але і навакольных аграгарадкоў: Лугавая Слабада, Гатава, Мачулішчы, Крупіца. Прыняўшы водныя ды іншыя працэдуры ў фізкультурна-аздараўленчым комплексе, яны змогуць працягнуць іх у рэабілітацыйным цэнтры.

### Культура пад адным дахам

З'явіцца ў аграгарадку і сучасны шматфункцыянальны культурны цэнтр для дзяцей і моладзі — пакуль рабочая назва.

— Гэта павінен быць прыгожы будынак са шкла, у якім дзеці змогуць развівацца. Магчыма, нават прафесійна навучацца дызайну, швейнаму ды іншаму майстэрству. Як казалі нашы бацькі, калі ўмееш працаваць рукамі, ніколі не застанешся без работы. Апошняя сустрэча з маладымі людзьмі паказала, што яны хочуць стаць фатографамі, кандытарамі, кухарамі. Для іх адкрыецца магчымасць авалодаць прафесійнымі навыкамі, — сцвярджае мая суразмоўніца.

— У нас ёсць установы культуры, абсталяваныя ўсім неабходным. Але яны знаходзяцца ў непрыстасаваных памяшканнях. Мы хочам у новым будынку аб'яднаць музычную, мастацкую школы, уладкаваць дэпазітарый Мінскай раённай бібліятэкі, узяць пад агульны дах Цэнтр культуры, — працягвае старшыня сельвыканкама.

Акрамя таго, ужо выдзелена пляцоўка для ўзвядзення гандлёва-забаўляльнага цэнтра. Засталося правесці аўкцыён, і сюды прыйдзе інвестар. У Міханавічах шмат гандлёвых аб'ектаў. Нават у неспрыяльныя часы ні адзін з іх не закрыўся, хіба што ў некаторых змяніліся ўласнікі. Нядаўна адкрыліся буйныя сеткавыя крамы «Суседзі», другі па ліку «Еўраопт». Але новы гандлёва-забаўляльны цэнтр неабходны. Гэта іншы ўзровень. Тут можна будзе не толькі атаварыцца, але і падсілкавацца, знайсці забаву па душы, паглядзець фільм разам з сям'ёй, любай дзяўчынай.



Новая дзіцячая пляцоўка.

### Глыток кіслароду

Святлану Давальцову, як прызналася сама, захапляюць праекты, якія не патрабуюць бюджэтных укладанняў, а толькі любові, увагі і настойлівасці ў рэалізацыі ідэі. Міханавічы — адзіны аграгарадок Міншчыны, дзе ў цэнтры ёсць балота, або, як прынята называць, лёгкія планеты. Тут можна рэалізаваць цудоўны праект, які будзе спрыяць экалагічнаму выхаванню дзяцей, прывіваць любоў да прыроды, вучыць іх захоўваць навакольнае асяроддзе, а не толькі ім карыстацца. Школьнікі змогуць прагульвацца па экалагічнай сцежцы, вывучаць флору і фаўну. Акрамя таго, мара Святланы Уладзіміраўны — арганізаваць у гэтым месцы карбонавую ферму. Простымі словамі — вырошчваць расліны, якія паглынаюць вуглякіслы газ і выдзяляюць кісларод.

Кісларод «накрывае» толькі палову Міханавіч. А з дапамогай такіх фермаў чыстым празрыстым паветрам змаглі б дыхаць жыхары не толькі аграгарадка, але і сельсавета і Мінскага раёна, сталіцы. У развіццё такіх навуковых палігонаў маглі б укладваць сродкі прадпрыемствы, што забруджваюць наваколле шкоднымі адходамі вытворчасці. Ёсць задума прыцягнуць да рэалізацыі ідэі школьнікаў, якія падрыхтавалі б на гэтую тэму рэфераты, курсавыя. Дзецям уласціва выдумка, фантазія, дапытлівасць, неардынарны падыход да любой справы.

— Наогул, тэма пакуль у стадыі абмеркавання. Але, думаю, гады праз тры мы зможам падзяліцца напрацоўкамі ў гэтым кірунку, — дадае Святлана Давальцова.

Кожная канцэпцыя павінна служыць развіццю тэрыторыі, каб жыццё людзей стала больш камфортным, багацейшым, каб яны маглі карыстацца ўсімі дабротамі цывілізацыі. Тым больш што аграгарадок у недалёкай перспектыве прырасце новымі насельнікамі.

У Міханавічах падрыхтаваны дзве пляцоўкі пад шматпавярховую забудову. Тут будзе выдзелена 500 кватэр для шматдзетных. А гэта не толькі дарослыя, але і дзеці, якіх у сям'і па трое і больш. Чакаецца, што насельніцтва павялічыцца на 2,5-3 тысячы. Таму неабходна да засялення людзей пашырыць «сацыялку», каб усё для іх было ў кропкавай даступнасці, каб дзеці вучыліся, развіваліся духоўна і фізічна, з карысцю адпачывалі, аздараўляліся. Гэтаму паспрыяе адкрыццё аб'ектаў, якія прадугледжаны канцэпцыяй рэгіянальнага развіцця.

А наогул старшыня сельвыканкама фантануе ідэямі. Што ні дзень, то новая. А яе падначаленыя заўсёды ўспрымаюць іх з бліскучымі вачыма і падтрымліваюць свайго кіраўніка.

